Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

15 КРАСАВІКА 2022 г. ПЯТНІЦА № 73 (29695)

ЦТ НЕ ЗА ГАРАМІ 3

РЭХА БУХЕНВАЛЬДА 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:

«Цяпер не ўзнікае пытанняў аб тым, што якія-небудзь знешнія пастаўшчыкі адмовяцца ад паставак ва ўмовах санкцыйнага ціску. Тэма закупак высокатэхналагічнага медыцынскага абсталявання і яго далейшага абслугоўвання знаходзіцца на пастаянным кантролі. Мы нацэлены на дыверсіфікацыю паставак медабсталявання. Безумоўна, з апорай і на нашы айчынныя ўзоры. Гэта тыя ж камп'ютарныя тамографы высокага класа, якія мы ўжо ўстанаўліваем. Думаю, пры неабходнасці будзе замяшчацца абсталяванне еўрапейскай ці амерыканскай вытворчасці. Сёння Кітай і многія заходнія кампаніі вырабляюць гэтае абсталяванне. Таму ў гэтых адносінах у нас боязі няма».

Трактарыст, сын трактарыста

Фота Анатоля КЛЕШНУКА.

Нарэшце ў паўночна-ўсходнім рэгіёне Беларусі — Аршанскім раёне — сышоў снег і падсыхае вільготная глеба, механізатары дружна выходзяць на палеткі. Аднымі з першых уключыліся ў пасяўную кампанію механізатары сельгаспрадпрыемства «Ларынаўка». Трактарыст Яўген ХМЯЛЬНІЦКІ *(на фота)* таксама задзейнічаны на падрыхтоўцы глебы пад будучы ўраджай, уносіць арганіку. Пасля гэтага ён будзе рабіць культывацыю і сеяць зерневыя і кукурузу. Дзесяць гадоў ён працуе ў найлепшым у раёне сельгаспрадпрыемстве.

Адказнаму і стараннаму работніку, яму даверылі некалі адзінак аўтатракторнай тэхнікі, але самы запатрабаваны ў механізатара магутны, з камп'ютарным кіраваннем трактар «Фенд». Трэці год ён кіруе трактарам, даглядае яго, таму тэхніка ніколі не падводзіць, не ламаецца. Яўген ганарыцца, што ён таксама звязаў жыццё з вёскай і пайшоў па слядах свайго бацькі-механізатара.

КАРАТКА

- У Беларусі падаражэюць паслугі пошты і электрасувязі. Рашэнне аб пераглядзе тарыфаў прынята ў рамках запланаванага павышэння рэгуляваных цэн і тарыфаў у 2022 годзе для забеспячэння кампенсацыі аператарам электра- і паштовай сувязі эканамічна абгрунтаваных затрат пры аказанні такіх паслуг.
- **Белтэлерадыёкампанія будзе транслiраваць велікодныя богаслужэнні з Мінска, Рыма і Ватыкана.**
- Грамадзянам Літвы і Латвіі з 15 красавіка дазволены бязвізавы ўезд у Беларусь.

ISSN 1990 — 763X

На кантролі

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ... З СЕЛЬМАГАМ

Ва ўсіх рэгіёнах краіны парламентарыі, прафсаюзы, дэпутаты базавага ўзроўню працягваюць актыўна аналізаваць цэны і асартымент сацыяльна значных прадуктаў і лекавых сродкаў. У сельскіх населеных пунктах Гомельскага раёна падобны маніторынг дазваляе працаваць з эмацыянальным складнікам паводзін пакупнікоў-вяскоўцаў. Сёння важна, упэўненыя кантралёры, папярэдзіць неабгрунтаваны ажыятаж на «сацыяльныя» прадукты, мець жывую сувязь з людзьмі, хутка рэагаваць на ўсе іх каментарыі і звароты.

АСАРТЫМЕНТ, ЦАНА І ЯКАСЦЬ

Падчас маніторынгу цэн і асартыменту сацыяльна значных тавараў сельскіх гандлёвых аб'ектаў **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Віктарыя ЛАДУЦЬКА і старшыня раённага аб'яднання прафсаюзаў Ларыса ЛЕГЛІК** наведалі крамы ў Чонках. Аграгарадок — цэнтр аднаго з самых густанаселеных сельсаветаў у раёне. Пакупніцкі попыт на тавары мясцовых крам, як правіла, вельмі высокі. На тэрыторыі Чонак знаходзяцца тры санаторыі, іх госці таксама прыходзяць сюды па пакупкі. Да таго ж, два чонкаўскія гандлёвыя аб'екты, дзяржаўны і прыватны, уключаныя ў праграму Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі для абавязковага маніторынгу цэн і асартыменту сацыяльна значных тавараў. Вынікі штомесячнага аналізу цэн па 91 пазіцыі найменняў прадукцыі ў іх фіксуюцца для перадачы ў МАРГ і рэагавання на рэспубліканскім узроўні.

СТАР. 3

Эканоміка

ВЫТОКІ МАЛОЧНЫХ РЭК

У чым заключаюцца складнікі паспяховасці жывёлагадоўчай галіны Брэстчыны

Даволі значны адрэзак часу Брэстчына трымае лідарства па краіне ў малочнай жывёлагадоўлі, паказчыках удояў малака ад каровы і ўносіць свой важкі ўклад у харчовую бяспеку краіны. На мінулым тыдні адбылося ўшанаванне перадавікоў галіны па выніках работы ў мінулым годзе. Прагучалі не толькі добрыя словы ў адрас віноўнікаў урачыстасці — былі названы асноўныя складнікі паспяховай работы.

СТАР. 4

На адной з фермаў ААТ «Мурава».

СВЯТА З ГЛЫБОКАЙ СТАРАЖЫТНАСЦІ

Сёння, 15 красавіка, іўдзеі ўсяго свету адзначаюць Песах — адно з самых значных свят іўдзейскага календара.

Гэтае васьмідзённае свята вясны і свабоды адзначаецца штогод у памяць аб сыходзе яўрэяў з Егіпта. Свята заўсёды пачынаецца напярэдадні 15-га дня Нісана па яўрэйскім месячным календары з захадам сонца. Яно ідзе каранямі ў глыбокую старажытнасць, сімвалізуе духоўнае вызваленне і з'яўляецца для яўрэйскага народа сувязным звяном паміж мінулым, цяперашнім і будучыняй. Беларускія іўдзеі таксама шырока адзначаюць дадзенае свята. У гэтай сувязі Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка павіншаваў сваіх суайчыннікаў — вернікаў іўдзейскай канфесіі.

«Гісторыя і культура яўрэяў многія стагоддзі непарыўна звязаны з Беларуссю, адзначаецца ў віншаванні. І сёння яўрэйская абшчына ў складзе шматнацыянальнай і шматканфесіянальнай беларускай сям'і ўносіць значны ўклад у развіццё міжрэлігійнага дыялогу, падтрыманне атмасферы ўзаемаразумення і талерантнасці ў нашай краіне».

«Няхай Песах прынясе ў кожны дом мір і дабрабыт, сагрэе сэрцы любоўю і цяплом сямейнага ачага», — сказана ў віншаванні Прэзідэнта.

Насуперак санкцыям

СЯРОД БЕЛАРУСАЎ GEELY НЕ ЛІЧЫЦЦА ЭКЗАТЫЧНАЙ МАШЫНАЙ

Карэспандэнт «Звязды» пабывала на «БелДжы» і пацікавілася, як паўплывала цяперашняя сітуацыя ў свеце на работу прадпрыемства.

Паміж гарадамі Жодзіна і Барысаў размешчана беларуска-кітайскае сумеснае прадпрыемства «БелДжы» па зборцы кітайскіх аўтамабіляў Geely. Калі едзеш па аўтатрасе, вачам адкрываецца велічнае відовішча. Карпусы ў гожых тонах, акуратна абгароджаная тэрыторыя, дзе на спецыяльных пляцоўках можна ўбачыць бліскучыя аўтамашыны, якія цешаць душу аматараў пракаціцца з ветрыкам. Менавіта гэты прынцыпова новы завод быў пабудаваны ў Беларусі для ажыццяўлення поўнага цыкла зборкі (зварка, афарбоўка) Geely Atlas і іншых сучасных машын маркі.

— Прадпрыемства займае 92 гектары, яго магутнасць такая, што на дзень за восем гадзін можна выпускаць 120 машын. Нескладаныя падлікі паказваюць, што гэта трыццаць тысяч аўто штогод. Менавіта такая колькасць легкавікоў была выраблена летась, — расказаў **дырэктар СЗАТ «БелДжы» Генадзь СВІДЭРСКІ**. — На заводзе працуе 1400 чалавек у адназменным рэжыме. Калі наладзіць работу ў дзве змены, то на год магчыма выпусціць з канвеера 60 тысяч машын. Вядома, гэта залежыць ад таго, як будуць купляць нашу прадукцыю спажыўцы, ад умоў рынку.

Прадпрыемства знаходзіцца ў зручным месцы для пастаўкі камплектуючых, тут да дробязяў прадумана лагістыка — побач праходзяць аўтамабільная дарога, чыгунка. Пасля паступлення камплектуючых працэс пачынаецца з іх зваркі. У вытворчасці Geely выкарыстоўваецца ацынкаваны метал з папярэдняй фасфатызацыяй, што дазваляе павялічваць антыкаразійныя ўласцівасці транспартнага сродку. А пасля нанясення сучаснага спецыяльнага лакафарбавага пакрыцця атрымліваецца кузаў, які можа быць устойлівы да карозіі больш за 10 гадоў.

Дадам, што пакрыццё лакам, фарбай, базавым слоем, апрацоўчай фарбай выконваецца робатамі.

Вядома, каб машына добра бегала, яе трэба пратэсціраваць на выпрабавальным палігоне. Калі выпрабаванні праходзяць паспяхова, яна ідзе спажыўцу.

У сістэме «БелДжы» ёсць і склады гатовай прадукцыі, дзе можа змясціцца адначасова чатыры тысячы аўтамабіляў. Але на той момант, калі дырэктар праводзіў для журналістаў экскурсію па прадпрыемстве, склады пуставалі. «Паколькі на нашы машыны вялікі попыт, то ўсё, што выпускаецца, адразу прадаецца», — растлумачыў Генадзь Свідэрскі.

— «БелДжы» — прадпрыемства беларуска-кітайскае, 60 % — доля беларускай дзяржавы, 40 % належыць кітайскай кампаніі Geely», — дадаў кіраўнік.

— Ці паўплывалі санкцыі, пандэмія каранавіруса на работу? — пацікавіліся ў яго.

— Вядома, сённяшнія праблемы не абмінулі і наш завод. Падчас пандэміі некаторыя кітайскія прадпрыемствы спыніліся, у выніку ў нас стала менш камплектуючых. Санкцыі мяняюць лагістычныя шляхі, больш працяглы час ідзе прадукцыя да спажыўца. Зразумела, усё гэта накладвае адбітак на нашу работу. Калі ўсё было спакойна, працаваць было значна прасцей, — лічыць Генадзь Свідэрскі.

І тым не менш, з пачатку адкрыцця завода з канвеера ўжо сышла 100-тысячная машына. З гэтай колькасці 70 тысяч прададзена ў Расійскую Федэрацыю, а трыццаць тысяч набылі спажыўцы Беларусі. На вуліцах нашых гарадоў усё больш гэтых машын, якія ўжо не лічацца экзатычнымі.

Прадпрыемства змагло даказаць, што Geely па сваіх якасцях, параметрах не горшы за «еўрапейцаў».

Фота Бел ТА.

— У сакавіку інтэрнэт смакаваў інфармацыю, што дзесьці на два тыдні персанал завода адправілі ў адпачынак. А хтосьці выказваўся, што на такое рашэнне кіраўніцтва паўплывалі санкцыі. Што ж адбылося на самай справе? — запыталіся ў дырэктара.

— У нас быў карпаратыўны водпуск. На заводах такога ўзроўню прынятыя часовыя перапынкі. Яны патрэбныя для прафілактыкі абсталявання. Калі людзі будуць хадзіць у водпуск па графіку, то на канвееры ўвесь час не будзе хапаць, напрыклад, 50 чалавек.

Спыніўся дырэктар прадпрыемства і на адрозненнях вытворчасці на кітайскім заводзе і беларускім. «У Кітаі, калі чалавек прыходзіць на завод, яму належыць 10 аплачваемых дзён адпачынку і пяць дзён па бальнічным лісце. Астатні час ён павінен працаваць. У Беларусі — 30 дзён адпачынку, бюлетэнь па непрацаздольнасці, водпуск па доглядзе за дзіцем, курсы павышэння кваліфікацыі. І ўсё гэта небясплатна для работадаўца. У выніку на канвеер неабходна паставіць, напрыклад, 120 чалавек, а працуе ўсяго 100. Акрамя таго, беларусы на рабочым месцы зарабляюць стаж, пенсію. А там (у КНР. — **Рэд.**) кажуць, што трэба добра выхоўваць дзяцей, якія будуць утрымліваць бацькоў у старасці. Па выслузе гадоў ім не належыць пенсія.

— Вось такія рэаліі, — падсумаваў сказанае Генадзь Свідэрскі. — І нашы людзі не цэняць падтрымку, якая ім аказваецца, не разумеюць простых рэчаў. А ў цэлым з кітайскімі партнёрамі працуем разам, плённа. Як той казаў, дарогу асіліць той, хто не баіцца цяжкасцяў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Блізкая ўлада

Выканкамы на сувязі

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 16 красавіка, з 9.00 да 12.00, правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;
- першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч КОЗЕЛ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Інтэграцыя

Прагматызм, канструктыўнасць і ініцыятыўнасць

Прагматызм, канструктыўнасць і ініцыятыўнасць — асноўныя прынцыпы старшынства Узбекістана ў ШАС, заявіў на брыфінгу «Узбекістан — ШАС: новыя грані стратэгічнага партнёрства» часовы павераны ў справах Рэспублікі Узбекістан у Беларусі Рахматула Назараў.

«Прагматызм, канструктыўнасць і ініцыятыўнасць — асноўныя прынцыпы старшынства Узбекістана. У рамках арганізацыі наша краіна вылучае шэраг актуальных ініцыятыў і прапаноў, якія садзейнічаюць узмацненню яе іміджу на міжнароднай арэне», — сказаў Рахматула Назараў.

Па словах часовага павераната, за апошнія пяць гадоў адносіны Узбекістана да ШАС змяніліся ў канструктыўным ключы — афіцыйны Ташкент удзельнічае ў супрацоўніцтве па ўсіх кірунках арганізацыі.

«Апошнія часы Узбекістан адкрыта заяўляе аб неабходнасці накіраваць гандлёвы патэнцыял ШАС на развіццё супрацоўніцтва ў такіх важных сферах, як транспарт, узаемасувязь, лагістыка, інавацыйнае і лічбавае развіццё, культура і народная дыпламатыя. Апошнім часам Узбекістан стаў адным з самых ініцыятыўных членаў ШАС. Гэта можна назваць вынікам стратэгіі, заснаванай на канструктывізме і прагматызме, іншымі словамі — імкненні ўзмацніць дзейнасць арганізацыі па важных кірунках і ўзбагаціць парадак дня», — падкрэсліў Рахматула Назараў.

На брыфінгу часовы павераны ў справах Рэспублікі Узбекістан у Беларусі прапанаваў пасольствам краін-членаў, назіральнікаў, партнёраў па дыялогу ў ШАС у Мінску арганізаваць клуб дзяржаў ШАС.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Рахматула Назараў пракаментаваў магчымасці, якія адкрыў для Узбекістана статус назіральніка ў Еўразійскім эканамічным саюзе.

«Сам факт, што мы з'яўляемся дзяржавай-назіральніцай, пра многае кажа. Гэта падкрэслівае жаданне Узбекістана больш узаемадзейнічаць з усімі дзяржавамі — членамі ЕАЭС. Мы маем такі статус і спадзяёмся, што ў будучыні ўзаемадзеянне будзе пашырацца. Але сыходзіць будзем з нашых нацыянальных інтарэсаў, — адзначыў часовы павераны. — Гэта пляцоўка дае нам магчымасць у шматбаковым і двухбаковым фарматах абмяркоўваць пытанні. Хацеў бы падзякаваць беларускім партнёрам за тое, што ў свой час падтрымалі наданне нам статусу назіральніка ў гэтай арганізацыі».

Марыя ДАДАЛКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Мядзведзеў: Расія ўзмоцніць свае заходнія граніцы ў выпадку ўступлення Швецыі і Фінляндыі ў НАТА

Расія ўзмоцніць свае заходнія граніцы ў выпадку ўступлення Швецыі і Фінляндыі ў НАТА, і тады ні аб якім бяз'ядзерным статусе Балтыкі гаворка весціся ўжо не зможа. Аб гэтым намеснік старшыні Савета Бяспекі РФ Дзмітрый Мядзведзеў напісаў у сваім Telegram-канале, паведамляе ТАСС.

«Калі Швецыя і Фінляндыя ўвойдуць у НАТА, працягласць сухапутных граніц альянсу з РФ вырасце больш як удвая, — адзначыў ён. — Зразумела, гэтыя граніцы давядзецца ўмацоўваць».

У прыватнасці, растлумачыў Дзмітрый Мядзведзеў, трэба будзе значна ўзмацніць групоўку сухапутных сіл і ППА, разгарнуць істотныя ваенна-марскія сілы ў акваторыі Фінскага заліва. «У такім выпадку ні аб якім бяз'ядзерным статусе Балтыкі гаворка весціся ўжо не зможа — баланс павінен быць адноўлены», — канстатаваў ён.

«Да сённяшняга дня Расія на такія меры не ішла і ісці не збіралася. Калі нас вымусяць, што ж, «заўважце, не мы гэта прапанавалі», як казаў герой вядомага старога фільма», — дадаў намеснік кіраўніка СБ РФ.

Ахвярамі паводак у ПАР сталі 300 чалавек

Прынамсі 300 чалавек сталі ахвярамі паводак у ПАР. Прэзідэнт краіны Сірыл Рамафоса назваў здарэнне катастрофай вялікіх маштабаў.

Значны ўрон нанесены правінцыі Квазулу-Натал і другому па велічыні гораду краіны Дурбан. З-за паводкі і апоўзняў тут разбурана шмат дамоў, загінулі сотні людзей. Пошукава-выратавальныя работы на месцы трагедыі працягваюцца, і не выключана, што колькасць ахвяр можа павялічыцца.

Уся правінцыя Квазулу-Натал аб'яўлена зонай бедства. Мясцовым жыхарам, якія засталіся без дому, давялося ўцякаць, але сітуацыю ўскладніла тое, што дарогі таксама значна пашкоджаны, многія масты былі разбураны.

Прычынай паводак сталі доўгія праліўныя дажджы, самыя моцныя за апошнія 60 гадоў. На думку вучоных, непагадзь стала праяўленнем кліматычных змяненняў. Сіноптыкі прадказваюць, што ў выхадныя дажджы прадоўжацца.

Жыхары ЗША сутыкнуліся з інфляцыйным шокам упершыню з 1970-х гадоў

Вядучы амерыканскага тэлеканала Fox Business Сцюарт Варні заявіў, што інфляцыя ў ЗША з'яўляецца «сапраўдным шокам», якога мясцовыя жыхары не бачылі 50 гадоў.

Ён адзначыў, што спажывецкія цэны ў Злучаных Штатах павялічыліся на 8,5 %. Варні выказаў меркаванне, што палітычныя апраўданні на гэты конт прэзідэнта Джо Байдэна не тлумачаць, чаму інфляцыя ўзнікла.

«Вось гэтыя глыбінныя прычыны: Федэральны рэзерв друкаваў грошы ў вялізных колькасцях; здабычу нафты і газу ў Амерыцы наўмысна скарацілі, і гэта палажыла канец нашай энергетычнай незалежнасці», — заявіў тэлевядучы.

Ён дадаў, што сёння ніхто ў Белым доме не можа сур'ёзна паўплываць на сітуацыю. Па-ранейшаму плануюцца вялікія выдаткі, узнікла пагроза рэцэсіі, прычым перад прэзідэнцкімі выбарамі, адзначыў Варні.

«Мне гэта нагадвае 1970-я, калі апошні раз быў рэзкі скачок інфляцыі. Тады ўсё скончылася цяжкай рэцэсіяй і скрышальным паражэннем дзеючага прэзідэнта-дэмакрата. Гэта было тады, а што цяпер?» — задаў пытанне тэлевядучы.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ... З СЕЛЬМАГАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Усё тут купляю, што трэба для сябе і сваёй пажылой маці, — адказвае на мае пытанні жыхарка Чонак Марына Яўгенаўна, якая па пакупкі абавязкова прыходзіць у краму Гомельскага філіяла абласнога спажывецкага таварыства. — Малако, тварог — усё з розным працэнтам тлустасці, розных вытворцаў. Чалавек можа сам і сэканоміць якую капейку, як хоча, бо выбар ёсць.

Па абароце продажу гэты магазін дзяржаўнай формы ўласнасці на першым месцы сярод філіялаў аблспажыўтаварыства ў раёне. За дзень толькі ў будні атаварваюць не менш як 600 чалавек. Шмат наведвальнікаў прыходзіць з найбліжэйшых санаторыяў. Верныя пакупнікі — маці малых дзетак — прыходзяць па свежую «малочку» для першага прыкорму.

— Нашы пакупнікі — мясцовыя жыхары, у асноўным, вядома, пенсіянеры, таму што побач крам няма, ездзіць у горад па прадукты цяжка, ды і не хочуць людзі, — тлумачыць **загадчыца крамы Людміла АФОНАВА**. — Добра бяруць малако, тварог, хлеб кожны дзень, булачкі і пірожныя мясцовай вытворчасці, гародніну абавязкова.

У гэтай краме ўжо больш за сто вяскоўцаў зарэгістравала карткі на сацыяльную скідку 10 %. Тавары, пазначаныя ў гэтым пераліку, поўнасцю ў асартыменце.

— Нават у перыяд ажыятажу, калі насельніцтва наша стала скупляць крупы, цукар, муку, тут не было пустых паліц, — кажа **старшыня раённага аб'яднання прафсаюзаў Ларыса ЛЕГЛІК**. — Мы ўвесь час звязваліся з загадчыцай крамы, выязджалі. Калі на момант маніторынгу чагосьці не было, то з раніцы ўсё абавязкова прывозілі, таму што на складах дастаткова прадукцыі.

Прафсаюзны і дэпутацкі лідары раёна адсочваюць не толькі наяўнасць тавараў спажывецкага кошыка, на кантролі і якасць прадукцыі. Фіксуюцца маркетынгавыя хады вытворцаў: калі пры старой цане памяншаецца вага тавару ва ўпакоўцы. Асаблівая ўвага і да ўсталяванай заканадаўствам цаны за кілаграм на сацыяльна значныя тавары. Калі фіксуюць перавышэнне ўстаноўленых паказчыкаў, інфармацыя перадаецца ў аддзел эканомікі райвыканкама.

— Штотыдзень праводзім экспрэс-маніторынг па 19 найменнях харчовага кошыка і шасці пазіцыях пладова-агароднінная прадукцыі. Гэта і «баршчавы набор», дзіцячае харчаванне, малочная прадукцыя, чай, курыца, — адзначае Ларыса Леглік. — Вывучаем таксама асартымент і цану не толькі на пазіцыі першай неабходнасці, але і на тавары, якія папулярныя ў нашых жыхароў — тое ж печыва, цукеркі.

Старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА аналізуе асартымент алею ў краме дзяржаўнай формы ўласнасці ў аг. Чонкі.

НАПІСАЦЬ ЗАГАДЧЫЦЫ КРАМЫ

Маніторынг абавязкова праводзяць і ў буйных магазінах прыватнай формы ўласнасці, якія толькі ў будні абслугоўваюць да тысячы пакупнікоў, і ў дробных прыватных гандлёвых пунктах. Пускаюць у гандлёвыя залы кантралёраў без лішніх пытанняў, адзначае Ларыса Леглік.

— Некалькі тыдняў таму мы заўважылі, што спажыўцы прыватных магазінаў у Чонках самі штучна выклікаюць ажыятаж на пэўныя тавары. Скупляюць цукар, грэчку, муку, буйную соль і мясныя кансервы. Але прадукцыя, нават у асартыменце, рэгулярна ў гандлёвай зале абнаўлялася. Сёння фіксуем, што цэны на пералік сацыяльна значных тавараў знаходзяцца ў рамках акрэсленых заканадаўствам меж, — канстатавала яна.

Загадчыца прыватнай крамы ў Чонках Марына ДЗЕМІДЗЕНКА любыя пытанні, прапановы, скаргі, запыты на тавары ад грамадзян прымае штодзень у сацыяльнай сетцы аграгарадка Чонкі-Сеўрукі. Такая зваротная сувязь, лічыць кіраўнік, вельмі эфектыўная.

Калі на гарадскіх рынках і ў фермераў-рэалізатараў падскочылі цэны на пладова-агароднінную прадукцыю, Ларыса Леглік асабіста правяла экспрэс-маніторынг цэн у фірменных магазінах сельгаспрадпрыемстваў раёна, якія рэалізоўваюць уласную прадукцыю са сваіх стабілізацыйных фондаў.

— Па зваротах грамадзян экспрэс-маніторынг можна правесці ў краме любога населенага пункта, — падкрэслівае прафсаюзны лідар. — Пры гэтым мы заклікаем грамадзян да канструктыўнай работы, карыстацца меню аператыўных сігналаў на сайце Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і інтэрнэт-рэсурсе раённага аб'яднання. Сёння дастаткова механізмаў, каб праверыць сігналы і паўплываць на падобныя сітуацыі, калі яны пацвердзяцца. Але калі людзі пішуць галаслоўныя каментарыі, гэта адцягвае ад работы.

Дарэчы

ЦЭНЫ Ў ІНТЭРНЭТ-КРАМАХ ПАД КАНТРОЛЕМ

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю спыняе выпадкі змянення цаны пасля афармлення заказу ў інтэрнэт-крамах, паведамілі ў прэс-службе МАРГ.

«Ведамства неаднаразова звяртала ўвагу інтэрнэт-прадаўцоў: недапушчальна мяняць цану тавару пасля афармлення спажыўцом заказу. Разам з тым у міністэрства прадаўжаюць паступаць звароты спажыўцоў, якім інтэрнэт-прадаўцы адмаўлялі ў дастаўцы тавару па цане, указанай пры яго заказе», — расказалі ў ведамстве.

Так, у МАРГ звярнулася грамадзянка, якая аформіла заказ у інтэрнэт-краме насення і саджанцаў, але перад адпраўкай ёй паведамілі аб павышэнні цаны на 15 працэнтаў. Інтэрнэт-прадаўцу ўказалі на неправамернасць такіх дзеянняў, той папрасіў прабачэння і адправіў спажыўцу тавар на першапачатковых умовах.

Іншы выпадак: грамадзянін заказаў і аплаціў у інтэрнэт-краме духавую шафу, але праз два дні яму паведамілі аб адсутнасці такога тавару на складзе і вярнулі грошы. У выніку пакупнік не змог набыць бытавы прыбор, а яго цана за гэты час вырасла на Br500. Пасля ўмяшання МАРГ духавая шафа ўсё ж была дастаўлена пакупніку па цане на дату яе заказу.

Старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў таксама актыўна вывучае пытанне харчовага забеспячэння праз сацыяльныя сеткі і месенджары райсавета.

— Напрыклад, пад фотасправаздачай маніторынгу крам у адным з населеных пунктаў маладыя маці пакінулі каментарый, у якім паведамілі пра абмежаваны асартымент дзіцячага харчавання ў пасёлку Юбілейны. Мы адразу выехалі на адрас з начальнікам аддзела эканомікі. Не-

Член Савета Рэспублікі Таццяна АБЕЛЬ і прафсаюзны лідар Гомельскага раёна Ларыса ЛЕГЛІК падчас маніторынгу наяўнасці тавараў у крамах Чонкаўскага сельсавета.

абавязкова ісці на прыём да прадстаўнікоў улады, каб атрымаць дапамогу ў такім пытанні, — адзначае Вікторыя Ладуцька. — Не так даўно жанчына паведаміла мне ў «Інстаграм», што яе позна ўнеслі ў графік на атрыманне бясплатнага дзіцячага харчавання. Мы вырашылі праблему разам з райспажыўтаварыствам. Жыхары не нашага раёна напісалі ў сацсетках райсавета аб тым, што з'явілі ся памідоры амаль па 30 рублёў за кілаграм. Мы прааналізавалі сітуацыю ў нас, пераканаліся, што такіх выпадкаў у раёне няма, і адказалі аўтару, каб людзі бачылі, што мы абавязкова на такое рэагуем.

Вікторыя Ладуцька дадае, што іншых паведамленняў пра рост цэн на прадукты ў сацыяльных сетках пакуль няма, як і фота пустых паліц.

У НОВЫМ РЫТМЕ

Сітуацыя ва Украіне паўплывала на пакупніцкія паводзіны вяскоўцаў, пагаджаюцца інспектары. Змяніўся і рытм маніторынгу цэн. Старшыня раённага аб'яднання прафсаюзаў і старшыня райсавета па сваёй ініцыятыве выязджалі ў населеныя пункты раёна штотыдзень у складзе мабільных груп.

— Маніторым работу гандлёвага аб'екта, аптэкі і наведваем калектывы арганізацый і прадпрыемстваў, — падкрэслівае Ларыса Леглік. — Такая работа дапамагае супакоіць людзей, засцерагчы ад эмацыянальнага рэагавання на фэйкі. Мы паведамляем людзям канкрэтныя факты, паказваем фатаграфіі з магазінаў і аптэк, даносім дакладную інфармацыю. Ва ўмовах інфармацыйнай вайны такая работа ў калектывах у спалучэнні з маніторынгам вельмі важная.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

У ТЭМУ

Да апошняга маніторынгу цэн і асартыменту сацыяльна значных тавараў сельскіх гандлёвых аб'ектаў на тэрыторыі Чонкаўскага сельсавета далучылася **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Таццяна АБЕЛЬ**:

— На фоне ўсіх знешнепалітычных падзей, напэўна, адна з самых актуальных тэм — забеспячэнне краіны харчаваннем і кантроль за цэнамі на прадукты. Сёння гэтым пытаннем займаюцца прадстаўнікі органаў улады ўсіх узроўняў. На асаблівым кантролі такія пытанні і ў парламентарыяў, — заўважыла сенатар. — Наша краіна ўжо не раз даказвала сваю самастойнасць у забеспячэнні насельніцтва харчаваннем. У актыўнай фазе знаходзіцца пасяўная, праведзены ўсе неабходныя мерапрыемствы па папаўненні запасаў, у тым ліку беларускай сыравіны. Сельскагаспадарчы сектар працуе ў штатным рэжыме.

Усё гэта стварае перадумовы для пазбягання рэзкага неабгрунтаванага росту цэн на ключавыя харчовыя тавары. Маніторынг цэн і асартыменту сацыяльна значных тавараў — гэта дадатковая мера, якая дазваляе забяспечваць дастойны ўзровень жыцця насельніцтва. Падчас выбарачнага зрэзу ўдаецца пагутарыць з пакупнікамі — грамадзянамі нашай краіны. Мы рэальна бачым іх перавагі і інтарэсы. Варта адзначыць, што побач з цаной вялікае значэнне надаецца і якасці прадукцыі. Часта перавага аддаецца тавару крыху даражэйшаму, але з праверанай якасцю. Адзначу, што тавары беларускай вытворчасці традыцыйна папулярныя ў насельніцтва.

Абітурыент-2022

ГРАФІК ЦТ

Цэнтралізаванае тэсціраванне ў Беларусі стартуе 14 чэрвеня

Пастановай Міністэрства адукацыі зацверджаны графік правядзення цэнтралізаванага тэсціравання.

14 чэрвеня беларускія абітурыенты будуць здаваць ЦТ па беларускай мове, 16 і 17 чэрвеня — рускую мову, 19 чэрвеня — грамадазнаўства, 21 і 22 чэрвеня — матэматыку, 24 чэрвеня — біялогію, 26 чэрвеня — замежную мову, 28 чэрвеня — хімію, 30 чэрвеня — фізіку, 2 ліпеня — гісторыю Беларусі, 4 ліпеня — геаграфію, 6 ліпеня — сусветную гісторыю навейшага часу. Вызначаны таксама рэзервовыя дні правядзення ЦТ: 12 і 14 ліпеня можна будзе здаць беларускую і рускую мовы, 12 і 16 ліпеня — астатнія прадметы.

Дакументам устаноўлены пералік устаноў адукацыі ў кожнай з абласцей і ў Мінску, вызначаных пунктамі правядзення ЦТ і пунктамі рэгістрацыі для яго праходжання. Пастановай вызначаны час работы пунктаў рэгістрацыі для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання — з 9.00 да 19.00 (па суботах (14, 28 мая, 2 ліпеня) — з 9.00 да 18.00). Тэрміны рэгістрацыі абітурыентаў для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні — з 2 да 7 ліпеня. Час пачатку ЦТ у асноўныя і рэзервовыя дні — 11.00.

База даных абітурыентаў фарміруецца з дапамогай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Агульнарэспубліканскі банк даных удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання».

Надзея НІКАЛАЕВА.

ВЫТОКІ МАЛОЧНЫХ РЭК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для пачатку крыху статыстыкі. Брэсцкую вобласць традыцыйна называюць аграрнай. У структуры эканомікі рэгіёна сельская гаспадарка складае 14,3 працэнта. Калі дадаць галіну перапрацоўкі, то гэта будзе больш за палову ўсёй народнай гаспадаркі. Асновай агрmaпрамысловага комплексу рэгіёна з'яўляецца жывёлагадоўля, якая дае звыш 80 працэнтаў выручкі. Тут выраз «Малочныя рэкі» — не метафара, а, хутчэй, рэальнасць, бо 60 працэнтаў эканомікі жывёлагадоўчай галіны складае рэалізацыя малака. Напрыклад, за дзесяцігоддзе гадавая вытворчасць малака павялічылася больш чым на 700 тысяч тон. Істотна выраслa пагалоўе малочнага статка. А галоўнае, значна павялічылася яго прадукцыйнасць. Варта сказаць, што ў малочнай жывёлагадоўлі Брэсцкая вобласць з 2007 года зрабіла каласальны рывок і выйшла па ўдоях малака на першае месца ў краіне.

Старшыня аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА, які шчыра дзякаваў жывёлаводам за іх работу, нагадаў, што летась вобласць адзіная ў краіне забяспечыла прырост валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі на 100,2 працэнта. За гэтай лічбай стаіць, несумненна, штодзённая праца работнікаў фермаў. Як і за тым, што цяпер сярэдні ўдой на карову ў рэгіёне перавысіў 6,5 тысячы кілаграмаў. Для параўнання была прыведзена лічба 2001 года — тады ад каровы атрымлівалі 2146 кілаграмаў. А сёння ёсць комплексы, якія можна без перабольшання назваць фабрыкамі малака. Напрыклад, у гаспадарцы «Моладава-Агра» Іванаўскага раёна атрымліваюць больш за 12 тон малака ад каровы на год.

Міністр сельскай гаспадаркі краіны Ігар БРЫЛО, які прыехаў асабіста адзначыць брэсцкіх жывёлаводаў, падкрэсліў значнасць экспартнага патэнцыялу рэгіёна. Міністр прывёў такія факты: «Мы выпускаем 828 кілаграмаў малака на душу насельніцтва (гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у свеце) і 137 кілаграмаў мяса. Узровень самазабеспячэння малаком у краіне — 256 працэнтаў, мясам — 135. Гэта сведчыць аб тым, што мы поўнасцю насычаем унутраны рынак і больш за палову малака экспартуем. Калі паглядзець у разрэзе Брэсцкай вобласці, то на яе прыходзіцца 26,5 працэнта экспарту. Адсюль відаць, наколькі важны гэты рэгіён у цэлым па экспартным патэнцыяле і агульнай вытворчасці сельгаспрадукцыі».

Усё, пра што сказана вышэй, ілюструе вынікі праведзенай работы. А якімі намаганнямі поспехі дасягнутыя, растлумачылі ў камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама. Гэта найперш мадэрнізацыя вытворчасці, укараненне новых тэхналогій, што цяпер асабліва актуальна, інфарматызацыя працэсаў. Калі сёння гаворыцца, што жывёлаводы трымаюць першыя пазіцыі ў краіне, то гэта азначае найперш паглыбленую работу па паляпшэнні якасных паказчыкаў малочнай прадукцыі і аднаўленчай здольнасці жывёлы, а таксама павышэнне яе генетычнага патэнцыялу, пароднага складу. У селекцыйнай рабоце вялікая роля належыць «Брэстплемпрадпрыемству». Яго рэсурсы дазваляюць весці мэтанакіраваную селекцыйную работу. Племянны ўлік ва ўсіх гаспадарках вобласці вядзецца ў інфармацыйнай сістэме «Племсправа». Ва ўказаную сістэму ўнесены фактычна ўсе жывёліны.

І яшчэ: добрае якаснае малако можна атрымаць толькі на сучаснай ферме. У галіне жывёлагадоўлі штогод рэалізоўваюцца дзясяткі інвестпраектаў па рэканструкцыі і будаўніцтве жывёлагадоўчых аб'ектаў. На ўрачыстым мерапрыемстве губернатар яшчэ раз падкрэсліў, што рэгіён мае амбіцыйныя планы па нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці: «Мы шмат будуем, уводзім новыя аб'екты і фермы пасля рэканструкцыі. Сёлета ў рабоце — 38 жывёлагадоўчых аб'ектаў. Шэсць з іх папярэдне запланавана здаць да Дня Незалежнасці».

На форуме жывёлаводаў, які праходзіў у Кобрыне, была наладжана дэгустацыя прадукцыі перапрацоўчых прадпрыемстваў. Як слушна заўважыў **генеральны дырэктар канцэрна «Брэстмясамалпрам» Міхаіл СЯРКОЎ**, брэндавыя брэсцкія перапрацоўшчыкі здабываюць прыхільнасць спажыўца выдатнай якасцю сваіх тавараў. Але ж з неадпаведнай сыравіны высакаякасны прадукт харчавання ніяк не зробіш. Таму працаўнікам вёскі ёсць чым ганарыцца.

На сцэну ў гэты дзень падымалася за ўзнагародамі каля 140 чалавек: аператары машыннага даення, лабаранты, тэхнікі-асемянатары, спецыялісты, кіраўнікі. Усе яны датычныя да тых салідных вынікаў, якія дэманструе Брэсцкая вобласць у жывёлагадоўлі. Сярод раёнаў — пераможцаў спаборніцтва ўзнагарод удастоены Баранавіцкі, Драгічынскі, Іванаўскі. Найлепшыя гаспадаркі — ААТ «Аснежыцкае» Пінскага, ААТ «Пескаўскае» Баразаўскага, ААТ «Новая Прыпяць» Столінскага. Не засталіся без адзнакі і аграрыі ААТ «Мурава» Пружанскага раёна. Не так даўно аўтару гэтых радкоў давялося пабываць на іх ферме і паназіраць, як зладжана працуе калектыў. Усе нацэлены на вынік, усе хварэюць за справу. Навокал чыста і акуратна, каровы выглядаюць дагледжанымі. А паказчыкі і вынікі штодзённай работы — у камп'ютары: у любы момант можна пацікавіцца і зрабіць выснову, дзе варта падправіць, што палепшыць. І ўсё малако ў іх ідзе класам «Экстра».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Надвор'е

КРАСАВІК СКУПЫ НА ЦЯПЛО

У выхадныя і ў першыя дні наступнага тыдня — мокры снег з дажджом

Толькі асобныя дні нагадваюць, што за вокнамі ўжо сярэдзіна вясны. Яшчэ ў апошні працоўны дзень тыдня тэрыторыя Беларусі будзе пад абаронай вобласці павышанага атмасфернага ціску і цёплых паветраных мас з Заходняй Еўропы, але... Паветраныя патокі зноў зменяць свой кірунак, і ў нашу краіну пачне паступаць халоднае паветра паўночных шырот, тэмпературны фон панізіцца, і ў выхадныя будзе ўжо ніжэй за кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Удзень у пятніцу чакаецца 8—14 градусаў вышэй за нуль, па паўднёва-ўсходняй палове краіны — плюс 15—19 градусаў.

Непрыемныя сюрпрызы ад надвор'я пачнуцца ўжо ў суботу. У гэты дзень часам пройдуць мокры снег і дождж. Удзень месцамі па краіне будзе ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 0 градусаў па паўночным захадзе да плюс 8 па паўднёвым усходзе краіны, удзень — 3—10 цяпла.

Халодна стане ў нядзелю. У апошні дзень тыдня над большай частцы краіны чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла. Удзень паветра прагрэецца да 2—8 градусаў вышэй за нуль, па паўднёвым захадзе — да 10 цяпла.

Халаднаватае надвор'е захаваецца і ў першыя дні наступнага тыдня. У панядзелак уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да плюс 4, удзень чакаецца 2—8 цяпла, месцамі да 10 градусаў вышэй за нуль.

У аўторак у многіх раёнах краіны будуць дажджы, удзень месцамі моцныя, а ўначы па паўднёвым захадзе магчымы мокры снег. Уначы тэмпература складзе ад нуля да 5 цяпла, удзень — ад плюс 4 градусаў да 12 цяпла. Па ўсходзе краіны ўначы 6—8 цяпла, удзень — плюс 13—15 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Белагропромбанк

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «100 000 на мечту!»

БЕЛКАРТ

Организатор рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак». УНП 192325716, 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, этаж 3.

Наименование рекламной игры: «100 000 на мечту!».

Территория проведения рекламной игры: Республика Беларусь.

Срок начала и окончания рекламной игры: игра проводится с 15 декабря 2021 года по 19 апреля 2022 года.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь (свидетельство о государственной регистрации № 4123 от 08 декабря 2021 года).

Сведения о количестве участников рекламной игры: в игре приняли участие 23 181 (двадцать три тысячи сто восемьдесят один) человек.

Сведения о розыгрыше призового фонда: призовой фонд (115 призов), общий размер которого составляет 237 328,08 (двести тридцать семь тысяч триста двадцать восемь) белорусских рублей 08 копеек разыгран полностью.

Список победителей розыгрышей № 1–№ 3:

	Розыгрыш № 1		Розыгрыш № 2		Розыгрыш № 3
	Приз № 1 – Денежный приз 3 000 BYN + Денежная сумма для оплаты комиссии банка в размере 76,92 бел. руб. + Денежная сумма для оплаты подоходного налога в размере 437,36 бел. руб.				
1	Дятлов Александр Дмитриевич	1	Дубчук Сергей Васильевич	1	Ждан Андрей Борисович
2	Кожан Алексей Сергеевич	2	Пальчевская Надежда Григорьевна	2	Пилипович Александр Анатольевич
3	Клименко Виктор Сергеевич	3	Ходор Сергей Валентинович	3	Занько Виталий Николаевич
	Приз № 2 – Денежный приз 1 000 BYN + Денежная сумма для оплаты комиссии банка в размере 25,64 бел. руб. + Денежная сумма для оплаты подоходного налога в размере 130,84 бел. руб.				
1	Казаченко Наталья Александровна	1	Руцкий Виталий Борисович	1	Худой Вячеслав Михайлович
2	Ярошевич Андрей Игоревич	2	Ястремский Михаил Иванович	2	Аковитая Евгения Григорьевна
3	Шпилевский Илья Андреевич	3	Новикова Инна Николаевна	3	Чернявский Андрей Андреевич
4	Головенко Иван Александрович	4	Строк Владимир Сергеевич	4	Лёля Наталья Николаевна
5	Киричко Магдалина Васильевна	5	Яренко Александр Николаевич	5	Воронич Леонид Михайлович
6	Шудло Алексей Николаевич	6	Грицевич Павел Васильевич	6	Азизов Дилшод Алиевич
7	Королёв Александр Александрович	7	Петренко Наталья Сергеевна	7	Земсков Павел Павлович
8	Юрченко Дмитрий Викторович	8	Шаровский Сергей Иванович	8	Фомич Анатолий Сергеевич
9	Кобецкая Татьяна Григорьевна	9	Ковальчук Анна Викторовна	9	Яцевич Елена Александровна
10	Ярош Юлия Викторовна	10	Сацук Диана Александровна	10	Истаков Василий Геннадьевич

	Розыгрыш № 1		Розыгрыш № 2		Розыгрыш № 3
	Приз № 3 – Денежный приз 500 BYN + Денежная сумма для оплаты комиссии банка в размере 12,82 бел. руб. + Денежная сумма для оплаты подоходного налога в размере 54,22 бел. руб.				
1	Боровик Андрей Леонидович	1	Капитонова Елена Викторовна	1	Ярош Максим Анатольевич
2	Забагонский Казимир Мечиславович	2	Михайлов Павел Сергеевич	2	Шкурко Светлана Ивановна
3	Шишов Роман Вячеславович	3	Чудинова Анастасия Игоревна	3	Шут Николай Васильевич
4	Глушанин Евгений Владимирович	4	Федорович Александр Николаевич	4	Климчук Сергей Владимирович
5	Литошик Виктор Викторович	5	Кутас Елизавета Николаевна	5	Рудницкая Валентина Ивановна
6	Красовская Елена Юрьевна	6	Козел Александр Алексеевич	6	Герасимова Елена Анатольевна
7	Ярчинская Наталья Михайловна	7	Цыганкова Раиса Викторовна	7	Кальман Андрей Яковлевич
8	Истаков Василий Геннадьевич	8	Мартунович Светлана Владимировна	8	Кудина Софья Александровна
9	Лаворенко Нина Михайловна	9	Хмара Анна Александровна	9	Тетерич Михаил Иванович
10	Ясточкина Ольга Михайловна	10	Ясюченя Марина Владимировна	10	Кондратьева Инна Николаевна
11	Шкараденок Елена Анатольевна	11	Яхновская Татьяна Владимировна	11	Проскурнина Наталья Николаевна
12	Яхновец Ирина Николаевна	12	Гоза Николай Васильевич	12	Глушень Анастасия Ивановна
13	Дмитренко Анна Николаевна	13	Яруллин Валерий Тимерьянович	13	Стахиевич Ксения Дмитриевна
14	Мишук Вадим Владимирович	14	Мышлен Светлана Викторовна	14	Раковец Степан Алексеевич
15	Шульга Галина Васильевна	15	Гайчев Юрий Дмитриевич	15	Самухин Иван Валентинович
	Приз «Забота» – Денежный приз 800 BYN + Денежная сумма для оплаты комиссии банка в размере 20,51 бел. руб. + Денежная сумма для оплаты подоходного налога в размере 100,19 бел. руб.				
1	Галыго Галина Александровна	1	Литвинова Светлана Васильевна	1	Микус Тамара Леонидовна
2	Талецкая Надежда Борисовна	2	Янченкова Валентина Алексеевна	2	Коваленок Евгения Иосифовна
3	Сафарьян Ольга Игоревна	3	Яцухно Василий Павлович	3	Рязанова Альфия Зиннуровна
4	Шур Геннадий Васильевич	4	Богданович Анатолий Николаевич	4	Учитель Светлана Владимировна
5	Мартынюк Иван Алексеевич	5	Шульга Николай Николаевич	5	Дудик София Аркадьевна
6	Анкуд Кристина Антоновна	6	Очкина Жанна Анатольевна	6	Страпко Нелли Владимировна
7	Кустикова Ирина Витальевна	7	Тарасюк Мария Афанасьевна	7	Кунцевич Андрей Анатольевич
8	Пархомик Анатолий Сергеевич	8	Шукалович Лилия Николаевна	8	Гуринович Оксана Николаевна
9	Пятница Светлана Владимировна	9	Гончарова Зоя Михайловна	9	Бордак Наталья Ивановна
10	Олейник Александр Михайлович	10	Гольдина Раиса Яковлевна	10	Готовцева Вера Ивановна

Победитель розыгрыша № 4: *главный приз – Денежный приз 100 000 BYN + Денежная сумма для оплаты комиссии банка в размере 2 564,10 бел. руб. + Денежная сумма для оплаты подоходного налога в размере 15 303,26 бел. руб.*
Юргель Александр Геннадьевич

Поздравляем победителей! Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: 8 029 385 51 10 ежедневно с 10.00 до 17.00.

МАЛАДЫЯ ТАЛЕНТЫ НА ПРЫСТУПКАХ ПАЎФІНАЛУ

Сёлета на XI Рэспубліканскі творчы радыёконкурс «Маладыя таленты Беларусі» падалі заяўкі 557 выканаўцаў і калектываў з розных куткоў краіны. У рамках першага тура адбор здзяйсняецца па відэа адзнятых работ, а пасля ўжо ўдзельнікаў чакае жывое праслухоўванне.

Адной з самых масавых намінацый па-ранейшаму застаецца «Эстрадны вакал», дзе па правілах першага тура ўдзельнікі выконваюць беларускія песні. Не менш цікавасці і актыўнасці праявілі і ў намінацыі «Інструментальная музыка», прычым у гэтым сезоне колькасць музыкантаў пераважае над колькасцю вакалістаў. Фальклорная намінацыя «Спадчына» таксама прапаноўвала канкурсантам працаваць з матэрыялам на роднай мове. І тут інструменталісты і вакалісты-класікі маюць магчымасць уразіць журы выкананнем сваіх любімых твораў акадэмічнага музычнага мастацтва.

А вось ацэньвае маладых і таленавітых вакалістаў і інструменталістаў ужо традыцыйна прафесійнае журы. Узначальвае яго і ў гэтым годзе нязменна народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік ансамбля народнай музыкі «Бяседа» Леанід Захлеўны. Пасля ацэнкі заяўленых работ у рамках першага тура найлепшыя, па меркаванні журы, выканаўцы трапяць у паўфінал і змогуць прэтэндаваць на жывыя праслухоўванні ў Вялікай студыі Дома радыё.

Імёны пераможцаў творчага спаборніцтва стануць вядомыя ў маі. У якасці ўзнагарод найлепшыя з найлепшых атрымаюць ад Першага нацыянальнага дыпломы лаўрэатаў і памятныя падарункі, а таксама магчымасць пачуць сябе на хвалях галоўнага радыёканала краіны. Падрабязнасці і навіны шукайце ў радыёэфіры і тэлеграм-канале «Радыё 1», а таксама ў інфармацыйных выпусках Агенцтва тэленавін на тэлеканале «Беларусь 1».

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 163

З 25 да 31 сакавіка ў Гомелі, у гасцінічным комплексе «Турыст», праходзіла першынство Беларусі па шашках-100 (моладзь 1996—2002 гг. н., юніёры, юніёркі 2003—2005 гг. н., юнакі і дзяўчаты 2006—2008 гг. н., 2009—2011 гг. н., 2012 г. н. і маладзей). Чэмпіёнамі ў сваіх групах сталі ў юнакоў С. Дарашэнка, А. Куніца, Г. Выдзерка, С. Астапаў, У. Чайкоўскі. У дзяўчат перамаглі В. Нікалаева, П. Петрусёва, Д. Нікіфарава, І. Барашка, Ю. Швед.

1—3 красавіка адбыўся чэмпіянат Мінскай вобласці па шашках-64 сярод мужчын і жанчын інвалідаў па зроку. Перамаглі А. Кур'ян і Е. Творгаль.

Першыя дзве кампазіцыі складзеныя Мікалаем Ляшкевічам з Мінска ў апрацоўцы ўкраінскага майстра Анатоля Панчанкі.

№ 46

№ 46

Белые простыя: f2, e3, g3, b4, f4, h4, g5, h6, e7 (9).

Черные простыя: h2, a3, d4, c5, d6, c7, g7, f8 (8).

№ 47

Белыя простыя: d4, f4, c5, g5, b6, f6, c7 (7).

Чорныя простыя: b2, d2, f2, e3, a7, d8, h8 (7).

Прыгожая камбінацыя здарылася па правілах бразільскіх шашак у інтэрнэт-турніры.

№ 48 vitalavvs — astuto

Белыя простыя: e1, b2, d2, f2, a3, c3, d4, f4, c5 (9).

Чорныя простыя: a5, g5, b6, h6, a7, c7, e7, f8, h8 (9).

1. c3-b4! У чорных выбар у чатырох напрамках, але па правілах бразільскіх шашак трэба біць большасць a5:g3 2. f2:d8 b6:d4 3. d8:g1+.

Наступныя кампазіцыі складзеныя вядучым аддзела №№ 49 і 50 па правілах бразільскіх шашак.

№ 49

Белыя простыя: c1, b2, h2, g3, b4, d4, f4, c5 (8).

Чорныя простыя: a3, a5, f6, a7, c7, e7, g7, d8 (8).

№ 50

Белыя простыя: e1, f2, h2, b4, c5, b6 (6).

Чорныя простыя: e5, e7, g7, дамкі g5 (4).

№ 51

Белыя простыя: 49, 50, 44, 45, 37, 31, 33, 28, 24, 19 (10).

Чорныя простыя: 40, 34, 35, 26, 27, 22, 17, 18, 13, 8 (10).

№ 52

Белыя простыя: 49, 50, 41, 42, 44, 45, 37, 33, 28 (9).

Чорныя простыя: 36, 40, 34, 35, 26, 22, 17, 18, 15, 8 (10).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні

Выпуск № 162 ад 01.04. 2022.

№ 39 1. e1-d2 c5:a7 2. d2-e3 f4:d2 3. h2:g1+.

№ 40 1. c7-d6 a5:e5 2. a7-b6 c5:a7 3. d2-e3 f4:d2 4. h2:g1+.

№ 41 1. a5-b6 e3:g1 2. b6-a7 h2:f4 3. d6-e7 f8:d6 4. c5:e3 a3:c5 5. d4:b6 g1:d4 6. b6-c7 d8:b6 7. a7:e3+.

№ 42 1.f2-e3 d4:f2 2. h2-g3 f4:h2 3. a1-b2 c3:a1 4. a5:g3 h2:f4 5. g7-h8 a1:g7 6. h8:c7 d8:b6 7. h4:a5 f4-g3 8. a5-b6 g3-h2 9. b6-g1 + ПР: 1.h2-g3 f4:h2 2.f2-e3 d4:f2 (калі

2...d2:f4 то: 3.a1-b2 c3:a1 4.a5:g3 h2:f4 5.g7-h8 a1:g7 6.h8:c7 d8:b6 7.h4:a5

f4-e3 8.a5-e1 х.) 3.a1-b2 c3:a1 4.a5:g3 h2:f4 5.g7-h8 a1:g7

6.h8:c7 d8:b6 7.h4:a5 f4-e3 8.a5-e1 х. (знайшоў С. Бурко)

№ 43 1. c7-b8 c3:a1 2. d6-e7 f8:d6 3. b8:h8 h6-g5

[3...d4-c3 4. h8:b2 a1:g3 5. h2:f4 +]

4. h8:c3 a1:g3 5. h2:h6+.

№ 44 **Белыя** c1, b2, f2, c3, f4, h4, f6, a7. **Чорныя** a3, e3, c5, b6, d6, h6, b8 1. f2:d4 c5:e7 2. a7:c5 d6:d2 3. c1:e3 a3:c1 4. e3-f4 c1:g5 5.h4:d8+.

№ 45 1. f2-g3 h4:d4 2. a5-b6 a3:e3 3. b6:d8 d4:b2 4. h6-g7 h8:f6 5. d8:a3 e5-d4 6. a3-b4 d4-e3 7. b4-e1+.

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Бурко (Орша), В.Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас:
газета «Звязда», г. Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013»
e-mail: info@zviazda.by
або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Чытайце ў красавіцкім нумары «Алесі»

ДЗЯКУЮ ЗА ВЕРУ І ПАДТРЫМКУ

Заслужаная артыстка Беларусі Вікторыя Алешка сёлета адзначае 25-годдзе творчай дзейнасці. У маі адбудзецца вялікі сольны канцэрт. Праграму «Дзякую» яна прадстаўляе ў знак удзячнасці ўсім тым, хто падтрымліваў, дапамагаў і заўсёды быў побач.

— Не маю звычкі падводзіць вынікі года, дзесяцігоддзя ці яшчэ нейкага перыяду свайго жыцця, — прызнаецца ў размове артыстка. — Але нават мяркуючы па кампліментах ад аўдыторыі і сяброў, я сёння і 20 гадоў таму — два розныя чалавекі. Толькі не варта забываць пра адваротны бок нашай прафесіі. За вонкавай раскошай, якую бачыць публіка і лічыць, як жа цудоўна: вось кветкі, авацыі, любоў, прызнанне, грошы, — стаіць штодзённая праца па пераадоленні сябе.

Пра каханне і веру, пра творчасць і свае мары Вікторыя Алешка распавяла чытачам «Алесі».

Мае вы родненькія!

10 красавіка ў розных краінах свету адзначаецца Дзень братоў і сясцёр (Siblings Day), закліканы ўмацаваць традыцыю падтрымкі роднасных, сямейных адносін.

Часопіс «Алеся» прапануе далучыцца да гэтай цудоўнай традыцыі і аб'яўляе чарговы сямейны конкурс «Мае вы родненькія!» Дашліце нам у рэдакцыю фотаздымак, на якім ёсць вы і ваш брат ці сястра, суправадзіце яго невялікім апавяданнем пра сямейныя адносіны і дружбу, за што вы ўдзячныя адно аднаму і г. д. Найлепшы аповед з фотаздымкам выйдзе ў найбліжэйшым нумары часопіса «Алеся». Думаецца, такая публікацыя стане выдатным падарункам вашаму роднаму чалавеку. Фотаздымак і аповед дасылайце на адрас: «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013 (на конкурс часопіса «Алеся») ці на e-mail: alesya@zviazda.by. А мы прадстаўляем вам артыкул пра цудоўных творчых людзей — брата і сястру Гур'евых: Анатоля і Ганну.

Два берагі адной ракі

Вядучы майстар сцэны Тэатра-студыі кінаакцёра Анатоль Гур'еў і салістка оперы Ганна Гур'ева — прадстаўнікі другога пакалення артыстычнай дынастыі. Заслужаны артыст БССР Віктар Гур'еў і салістка оперы Лідзія Шаўчэнка шмат дзесяцігоддзяў служылі ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі, у якім сёння працуе іх дачка Ганна.

7.05 Навіны эканомікі.
7.10, 18.15, 23.30 Зона Х (16+).
8.05 Зразумелая палітыка.
9.10, 21.45 Серыял «След» (16+).
10.45, 0.05 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Дыпламат» (16+).
13.55 «Здорава здоровым быць!» (6+) [СЦ]
14.40, 15.25 Драма «Плакучая вярба» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
21.00 Панарама.
23.15 Сфера інтарэсаў.
23.50 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.30 Тэлебарометр.
9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 17.45 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
10.50, 22.05 Серыял «Такая работа» (16+).
12.15 «Сямейныя гісторыі» (16+).
12.45, 21.15 Серыял «Доктар Надзея»(16+).
13.30, 18.35 «Веру не веру» (16+).
14.20 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
14.45 «Вось такія людзі» (12+).
15.05 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Да пабачэння» (16+).
19.20 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
23.35 «Багіня шопінгу. Бітва бландзінак» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.10 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 16.45, 20.30, 23.55 Навіны культуры.
8.15, 18.30 «Акцёркія лёсы. Юрый Васільеў і Аляксандр Фацюшын». Дак. фільм (12+) [СЦ].
8.40, 18.55 «Лякарства супраць страху». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.10 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
10.25 «Люблю і памятаю».
11.05, 17.35 «Дом з лілеямі». Серыял (16+) [СЦ].
12.40 «Наперад у мінулае».
13.05, 21.05 «Сямнаццаць імгненняў вясны». Серыял (12+) [СЦ].
15.25 «Кадры жыцця».
16.20 «Кампазітары Беларусі».
16.55 «Сваімі словамі».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.25 «Камертон».

Беларусь 5

7.00 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «Віктарыя» (Смалявічы) — ХК «Мінск».
8.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Манчэстэр Юнайтэд».
10.20 Спорт-кадр.
10.55 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Юнацтва-Мінск».
12.55 Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны.
14.55 Вось гэта спорт!
15.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
16.15 Слэм-данк.
16.50 Хакей. КХЛ.
19.20 Баскетбол. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «Гарызонт» (Мінск) — «Алімпія» (Гродна).
21.15 Між іншым.
21.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Арсенал».
23.40 Аўтаспорт. Экстрым-Е. Відэасапіс.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў» (12+).
10.15 «Жыць здорава!» (16+)
11.15, 22.15 Серыял «Я вярнуся» (12+).
13.15, 16.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» (12+)
19.00 «Аб'ектыўНа» (16+).
20.00 Вячэрнія навіны.
21.15 Фільм «Начальнік разведкі» (16+).
0.05 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 23.20 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.15, 20.55, 1.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 0.10 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
16.00, 16.50 «Полымя над попелам». Серыял (12+).
20.25, 23.05 «СТБ-спорт».
20.30 «Сталічныя падрабязнасці».
20.40 «Міншчына».
23.10 «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў».

МІР

5.00, 10.10 Серыял «Таццяніна ноч» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15, 17.50, 3.05 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15, 2.00 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10, 2.40 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.05 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.05 «Гульня ў кіно» (12+).
20.45, 21.35 «Слабае звяно» (12+).
22.30 «Назад у будучыню» (16+).
23.15 Мастацкі фільм «Небяспечна для жыцця» (12+).
0.45, 1.10 «Гістарычны дэтэктыў з Мікалаем Валуевым» (12+).
1.35 Здабытак рэспублік» (12+).
3.50 Серыял «Мой капітан» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Серыял «Земскі доктар» (12+).
20.35 «Р.S.»
21.05 Тэлесерыял.
22.10, 23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).
0.40 Фільм «Люба. Каханне» (16+).

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15, 7.15, 8.00, 16.40, 19.55, 21.55, 23.10 Сёння. Галоўнае.
6.20 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.00 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.10, 22.00 «НЗ.by».
8.30 Пракурорская праверка (16+).
9.30 Баявік «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы» (16+).
13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55, 16.50 Серыял «Прафесіянал» (16+).
17.10 «За гранню» (16+).
18.05 «ДНК» (16+).
20.10, 22.20 Серыял «Паліцэйскае брацтва» (16+).
23.30 Серыял «Снайпер. Зброя адплаты» (12+).

8 канал

7.00, 15.05, 17.40, 21.05, 1.05 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Рапунцэль» (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (6+).
8.15 Серыял «Закінутыя ў космасе» (12+).
9.15 Серыял «Эквадор».
10.00 Драма «Хітрасці лёсу» (16+).
11.35 Серыял «Чукур» (16+).
13.05 Драма «Аперацыя «Валькірыя» (16+).
15.10 «Хачу ў кіно» (12+).
15.20 Мультпарад. «Дом Савы» (0+).
16.00 Серыял «Абацтва Даўнтан» (18+).
17.45 «Любімае кіно» (16+).
20.00 Серыял «Сіндром» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.10 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
21.20 Трылер «Галоўны герой» (16+).
23.10 Драма «На грані» (16+).

ВТБ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
12.00 «Велабайкі» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.25 «Эксперыменты» (12+).
13.50 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
14.45 Серыял «Па калена» (16+).
16.05 «6 кадраў» (16+).
17.00 «Суперліга» (16+).
18.20 Серыял «Пагрукай у мае дзверы» (16+).
21.30 Камедыя «Нязносныя босы» (16+).
23.10 Трылер «Таямнічы лес» (16+).
0.55 «Уральскія пельмені» (16+).
2.10 Серыял «Кадэцтва» (12+).
3.45 «Адна за ўсіх» (16+).
5.00 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.20, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 «Гісторыі ў фарфоры». Серыял.
7.35 «Ісус Хрыстос. Жыццё і вучэнне» [СЦ].
8.25 Легенды сусветнага кіно.
8.50 «Іркуцкая гісторыя». Маст. фільм [СЦ].
10.20 «Стары наезнік». Маст. фільм.
11.50 «Забытае рамяство». Серыял.
12.05 «Продкі нашых продкаў». Серыял.
12.45 Улада факта.
13.30 «Дом». Дак. фільм.
14.30 «Уладзімір Мінін. Маналог у 4 частках» [СЦ].
15.05 Лісты з правінцыі [СЦ].
15.35 «Энігма. Айдар Гайнулін».
16.15 «Малайзія. Вострай Лангкаві». Дак. фільм.
16.40 «Дзве сястры». Маст. фільм [СЦ].
17.45 «1918. Уцёкі з Расіі». Дак. фільм.
18.45 «Квіток у Вялікі».
19.45 Шукальнікі.
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 Лінія жыцця [СЦ].
21.45 «Адзінцова. Васільеўскі замак». Дак. фільм.
22.15 «Пётр Першы. Заваяванне». Серыял (16+). [СЦ].
23.10 «Неспадзяваны партрэт. Валянцін Курбатаў. Апошнія». Серыял [СЦ].
0.00 «...І будзе дачка». Маст. фільм.
1.10 Шэдэўры рускай харавой музыкі.
2.00 «Дом». Дак. фільм.

Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» (12+)
6.55, 8.40, 9.40, 11.00, 12.50, 14.40, 15.40, 17.00, 18.40, 20.50, 21.40, 23.40, 0.50, 2.40, 3.0.0.
7.20 Мастацкі фільм «Кантрабанда» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
13.15 Мастацкі фільм «Цягнік да Брукліна» (18+).
18.00 «Да і пасля...» (16+)
18.55 Мастацкі фільм «Барханаў і яго целаахоўнік» (18+).
22.00 «Колба часу» (16+).
23.00 «Блеф-клуб» (16+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.20 Маст. фільм «Агенты КДБ таксама ўлюбляюцца» (18+).

EuroSport 1

0.00, 4.00, 8.00, 11.00, 12.00, 16.25, 20.45 Снукер. Чэмпіянат свету (6+).
0.55, 20.40 Навіны (16+).
1.00, 6.00, 15.00, 19.30 Веласпорт. Тур Альпаў (16+).
1.45, 7.00, 10.15 Веласпорт. «Флэш Валонь». Жанчыны (16+).
2.30 Веласпорт. «Флэш Валонь». Мужчыны (16+).
9.30 Веласпорт. «Парыж — Рубе». Жанчыны (16+).

Кінакамедыя

1.15 Чарапашкі-ніндзя-3 (6+).
2.55 Год свінні (16+).
4.20 Каханне і іншыя непрыемнасці (16+).
6.05 Ёлкі апошнія (6+).
7.55 Першая дачка (12+).
9.55 Норт (12+).
11.35 Голая праўда (16+).
13.20 Хто падставіў труса Роджэра (16+).
15.15 Хто я? (12+)
17.35 Нічога не бачу, нічога не чую (16+).
19.30 Дзяўчына маіх кашмараў (16+).
21.35 Акей, Лексі! (18+)
23.10 Зноў ты (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.25 «Громавы. Дом надзеі» (16+).
10.20, 4.00 «Паглядзім» (12+).
10.50 «Поўня». Серыял (16+).
12.05, 1.30 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.00 «Любоўная магія» (16+).
13.30, 18.05, 2.20 «Сляпая» (16+).
14.25, 19.00, 3.10 «Варажбітка» (16+).
15.20 «Гэтая рэальная гісторыя». (16+).
16.15 «Пагоня па смак» (16+).
17.10 «Ведзьмакі свету» (16+).
19.55 «Другое жыццё Увэ» (16+).
22.00 «Троя» (16+).
0.40 «Гарадскія легенды» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

6.00, 6.40, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
7.45 Сужэнцы Морган ва ўцёках (16+).
9.40 Аднойчы ў Рыме (16+).
11.10 Як выйсці замуж за 3 дні (16+).
13.00 Госці (16+).
15.10 Узыходжанне Юпітэр (16+).
19.00 Якія змяняюць рэальнасць (16+).
20.50 Час (16+).
22.45 Тайна сямі сясцёр (16+).
0.55 Трэнер Картэр (12+).
3.05 Гонка (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.55 Праклятыя чыноўнік (16+).
7.45 Напарнік (12+).
9.15 Лёгкі на ўспамін (12+).
10.40 Падарунак з характарам (6+).
12.10 Роба (6+).
13.40 Прывід (6+).
15.40 Праклятыя чыноўнік (16+).
17.10, 17.40, 18.05, 18.30 Апошні з Магікян (12+).
19.00 Уцякаць, дагнаць, закахацца (12+).
20.25 Аднакласніцы (16+).
21.50 Аднакласніцы: новы паварот (16+).
23.05 Выкрутасы (12+).
0.45 Ну, добры дзень, Аксана Сакалова! (16+)
2.20 Няўлоўныя (16+).
3.50 Няўлоўныя: апошні герой (16+).

National Geographic

6.00, 5.35 Навуковыя глупствы (16+).
6.20 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.00, 8.55 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
9.55, 10.45 Аўта-SOS (16+).
11.40, 12.25 Дзікі тунец (16+).
13.15, 14.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.00, 15.50, 2.00, 2.45 Космас: магчымыя сусветы (16+).
16.45 Злавіць кантрабандыста (16+).
17.35 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.25, 18.50 Фабрыка ежы ў Амерыцы (16+).
19.15 Невядомая планета Зямля (16+).
20.05 «Жывая зямля» (16+).
21.00, 21.50, 3.30 Егіпет з вышыні птушынага палёту (16+).
22.45 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
0.25, 1.15 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
4.15 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
5.00, 5.25 Гульні розуму (16+).

Discovery

8.00, 7.35 Як гэта ўладкована? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45 Утыльшчыкі: заезд на ракеце (12+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40 Як гэта зроблена? (12+).
12.05, 13.00 Залатая ліхаманка (18+).
13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10 Бітвы за кантэйнеры (12+).
17.35 Вулічныя гонкі (12+).
18.30 Палёты ўглыб Аляскі (12+).
19.25, 4.27 Вялікія брудныя гонкі (12+).
20.20 Гульня камянёў (16+).
23.05, 5.14 Загадка ранча Блайнд-Фрог (16+).
0.00, 6.01 Дарожныя каўбоі (18+).
0.55, 6.48 Бітва пітмайстраў (12+).
1.50, 3.40 Смяротны ўлоў (18+).

У праграме магчымы змяненні.
Перадрукоўка праграмы забаронена.
[СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25, 18.15 Зона Х (16+).
9.10 Серыял «След» (16+).
10.45, 0.50 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Незабытая» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Доўгая дарога да шчасця» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Дача (12+).
17.30 Існасць [СЦ].
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
22.50 Драма «Пацалуеў мост» (12+).
0.35 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.20 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 17.35 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
10.50 Серыял «Такая работа» (16+).
12.20 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
12.50 Серыял «Доктар Надзея» (16+).
13.40 «Веру не веру» (16+).
14.25 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
14.50 «Вось такія людзі» (12+).
15.05 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Да пабачэння» (16+).
18.25 «На нажах» (16+).
19.20 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
20.10, 21.15 «Тата папаў» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
22.40 «Амаль былыя» (16+).
0.25 «Багіня шопінгу. Бітва бландзінак» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 16.45, 20.30, 0.05 Навіны культуры.
8.15, 18.30 «Вера Глаголева. Якая сышла ў нябёсы». Дак. фільм (12+) [СЦ].
8.50, 19.10 «Яны сышлі з нябёсаў». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.10 «Майстры і куміры».
11.05, 17.35 «Дом з лілеямі». Серыял (16+) [СЦ].
12.10 «Сіла веры».
12.35 «Наперад у мінулае».
13.05, 21.05 «Сямнаццаць імгненняў вясны». Серыял (12+) [СЦ].
15.35 «Кадры жыцця».
16.30 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
16.55 «Сваімі словамі».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.35 «Камертон».

Беларусь 5

7.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Бернлі» — «Саўтгэмптан».
8.55 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. ХК «Мінск» — «Будаўнік» (Брэст).
10.20 Хакей для ўсіх.
10.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Металург» (Жлобін).
12.50 Насустрач мары. ЧС па футболе — 2022. Хранікальна-дакументальны фільм.
13.50 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. ХК «Мінск» — «Будаўнік» (Брэст).
15.20, 22.40 Валейбол. Таварыскі матч. Юнакі (U-18). Беларусь — Расія.
17.20 Авертайм.
17.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск).
19.50 Хакей. КХЛ.
21.50 Планета спорту.
22.10 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў» (12+).
10.15 «Жыць здорава!» (16+)
11.15, 0.00 Серыял «Я вярнуся» (12+).
13.15, 16.45, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
16.20 «Трывожная кнопка» (16+).
18.45 «Удача ў прыдачу!» (12+)
18.50 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Вячэрнія навіны.
21.15 Фільм «Нялёгкае шчасце» (12+).
22.55 «Што? Дзе? Калі?» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 23.20 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 0.55 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 0.05 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.45 Дакументальны спецпраект (16+).
16.50 «Вялікія таямніцы» (16+).
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Міншчына».
20.40 «Тайны Беларусі».
21.35 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
23.10 «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў».

МІР

5.00 Мультфільмы (0+).
7.10, 10.20, 1.30 Серыял «Ганна Герман. Таямніца белага анёла» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.20 Мастацкі фільм «Міміно» (12+).
19.15 «Слабае звяно» (12+).
20.10 «Гульня ў кіно» (12+).
20.50 «Сусветныя гульні розуму» (16+).
21.25 Мастацкі фільм «Небяспечна для жыцця» (12+).
23.05 Мастацкі фільм «Інтэрдзяўчынка» (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Серыял «Земскі доктар» (12+).
21.05 Фільм «Сардэчная недастатковасць» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15, 7.15, 8.25, 16.40, 19.55, 22.30, 23.40 Сёння. Галоўнае.
6.20 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.00 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.00 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы» (16+).
11.25 Баявік «Марскія д'яблы. Рубяжы радзімы» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55, 16.50 Серыял «Прафесіянал» (16+).
18.05 «Чакай мяне» (12+).
20.10 «Следства вялі...» (16+)
21.30, 22.35 «Краіна талентаў» (12+).
23.55 «Па следзе монстра» (16+).

8 канал

7.00, 15.15, 18.55, 21.10, 1.25 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Рапунцэль» (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (6+).
8.15 Вестэрн «Апачы» (12+).
9.45 Серыял «Эквадор».
10.30 Драма «Хітрасці лёсу» (16+).
12.10 Серыял «Чукур» (16+).
13.40, 17.05 «Любімае кіно» (12+).
15.20 «Хачу ў кіно» (12+).
15.30 Мультпарад. «Амфібія» (0+).
15.55 Серыял «Абацтва Даўнтан» (18+).
19.00 Серыял «Сіндром» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.15 «Героі коміксаў на экране» (12+).
23.25 Баявік «На грэбні хвалі» (16+).

ВТБ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45, 23.10 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.00 «Наш рамонт» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.25 «Эксперыменты» (12+).
13.50 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
14.45, 18.40 Серыял «Па калена» (16+).
16.05 Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
17.00 Серыял «Вялікая гульня» (16+).
20.00 Серыял «Пагрукай у мае дзверы» (16+).
21.00 «Драма «Клуб аматараў кніг і пірагоў з бульбяных ачысткаў» (12+).
0.00 Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
0.55 Серыял «90-я. Весела і гучна» (16+).
2.35 Серыял «Кадэцтва» (12+).
4.10 «Адна за ўсіх» (16+).
5.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.00 ХХ стагоддзе.
12.05 «Продкі нашых продкаў». Серыял.
12.45 Штучны адбор.
13.30 «Забытае рамяство». Серыял. «Трубачыст».
13.45, 1.45 «Паднябесная Іакінфа Бічурына». Дак. фільм.
14.30 «Уладзімір Мінін. Маналог у 4 частках» [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.50 «Белая студыя».
16.35 «Іркуцкая гісторыя». Маст. фільм [СЦ].
17.45, 0.50 Шэдэўры рускай харавой музыкі.
18.40 «Ісус Хрыстос. Жыццё і вучэнне» [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Почырк эпохі» [СЦ].
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 Астравы [СЦ].
21.30 Улада факта.
22.15 «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял [СЦ].
23.10 «Неспадзяваны партрэт. Валянцін Курбатаў. Апошнія». Серыял [СЦ].
2.25 Раман у камені.

Настальгія

6.00 «СевАлогія» (18+).
6.55, 8.40, 9.40, 11.00, 12.50, 14.40, 15.40, 17.00, 18.55, 20.40, 21.40, 23.00, 0.55 Музычная настальгія.
7.20 Мастацкі фільм «Арол і рэшка» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Быў час» (16+).
13.20 Маст. фільм «Агенты КДБ таксама ўлюбляюцца» (18+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
19.20 Мастацкі фільм «Кантрабанда» (18+).
1.35 Канцэрт Яўгена Клячкіна (16+).
2.45 «Сядзі і глядзі» (18+).
3.45 Маст. фільм «Анкор, яшчэ анкор!» (18+)
5.25 «Блеф-клуб» (16+).

EuroSport 1

0.00, 4.00, 9.30, 17.45, 19.30, 20.45 Снукер. Чэмпіянат свету (6+).
0.55, 20.40 Навіны (16+).
1.00 Тэлечасопіс «Дух парусnага спорту» (6+).
1.30 Тэлечасопіс EWC All Access (16+).
2.00, 6.00, 13.30, 14.00 Веласпорт. Тур Альпаў (16+).
2.30, 8.00 Мотагонкі на выносlівасць. «24 гадзіны Ле-Мана» (16+).
7.00 Веласпорт. «Парыж — Рубе». Мужчыны (16+).
11.00 Тэлечасопіс «Дух ветразнага спорту» (6+).
11.30 Веласпорт. «Парыж — Рубе». Жанчыны (16+).
12.10 Веласпорт. «Флэш Валонь». Жанчыны.
15.30 Веласпорт. «Флэш Валонь». Мужчыны.

Кінакамедыя

0.45 Чарапашкі-ніндзя (12+).
2.55 Занадта крута для цябе (16+).
4.45 Сястрычка, дзейнічай (12+).
6.40 Каханне і іншыя непрыемнасці (16+).
8.25 Чаму ён? (16+)
10.35 Красуні ва ўцёках (16+).
12.10 Норт (12+).
13.50 Першая дачка (12+).
15.45 Голая праўда (16+).
17.35 Зноў ты (16+).
19.30 Калі свякроў — монстар... (16+)
21.20 Чарапашкі-ніндзя-3 (6+).
23.10 Колькі ў цябе? (16+)

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.55 «Громавы. Дом надзеі» (16+).
10.50 «Перыскоп» (16+).
11.10 «Поўня». Серыял (16+).
12.15 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.05, 17.25 «Любоўная магія» (16+).
13.35, 18.00 «Старац» (16+).
14.35, 19.35, 3.45 «Сляпая» (16+).
15.30, 20.35 «Варажбітка» (16+).
16.25 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
19.00 «Чытальнік» (12+).
21.35 «Сельскі дэтэктыў» (16+).
22.30 «На шляху да сэрца» (16+).
23.30 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.25 «Лінія абароны» (16+).
0.55 «Пёрл Харбар» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.10, 5.50, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
7.00 Развод па-амерыканску (16+).
9.10 Марлі і я (12+).
11.15 Прытварыся маёй жонкай (16+).
13.20 Захавальнік часу (12+).
15.35 Лемані Знікет: 33 няшчасці (12+).
19.00 Праўдзівая хлусня (16+).
21.35 Кілеры (16+).
23.15 Бандыткі (12+).
0.55 Іншапланецянін (6+).
2.45 Пяты элемент (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.25 Падарунак з характарам (6+).
6.50 Параграф 78: фільм першы (16+).
8.50 Параграф 78: фільм другі (16+).
10.20 Выкрутасы (12+).
12.05 Ну, добры дзень, Аксана Сакалова! (16+)
13.55 Напарнік (12+).
15.25 Канікулы прэзідэнта (16+).
17.10, 17.40, 18.05, 18.30 Апошні з Магікян (12+).
19.00, 1.25 Золушка (16+).
20.35, 2.55 Каралева (12+).
22.05 14+ (16+).
23.55 Напарнік (12+).
4.20 Зацьменне (12+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.25 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.10, 9.00 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
9.55, 10.50, 16.45 АўтаSOS (16+).
11.40, 12.30 Дзікі тунец (16+).
13.20, 14.10, 19.15, 20.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.00, 15.55, 1.55, 2.45 Космас: магчымыя сусветы (16+).
17.40 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.30, 18.55 Фабрыка ежы ў Амерыцы (16+).
21.00, 21.50, 3.30 Інстынкт выжывання (16+).
22.45 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
0.25, 1.10 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
4.20 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
5.05, 5.35 Гульні розуму (16+).

Discovery

8.00, 1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Утыльшчыкі: заезд на ракеце (12+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40 Як гэта зроблена? (12+).
12.05 Як уладкаваны Сусвет (16+).
13.00 Давід Андрэс каляскіць па свеце (12+).
13.55 Грандыёзныя машыны Аляскі (12+).
14.50 Заканадаўцы тэхналогій (12+).
17.35 Вулічныя гонкі (16+).
18.30 Палёты ўглыб Аляскі (12+).
19.25, 4.27 Вялікія брудныя гонкі (12+).
23.05, 5.14 Пчаліны кароль (12+).
0.00, 6.01 Голыя і напалоханыя (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 21 красавіка ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.00 Зона Х (16+).
9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.45, 0.35 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Незабытая» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Доўгая дарога да шчасця» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (12+).
23.45 Сфера інтарэсаў.
0.20 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+).
9.00, 18.30 Тэлебарометр.
9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 17.35 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
10.50, 22.05 Серыял «Такая работа» (16+).
12.20 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
12.50, 21.15 Серыял «Доктар Надзея» (16+).
13.40, 18.35 «Веру не веру» (16+).
14.20 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
14.50 «Вось такія людзі» (12+).
15.05 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Да пабачэння» (16+).
19.20 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
23.30 «Багіня шопінгу. Бітва бландзінак» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.10 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 16.20, 20.30, 23.50 Навіны культуры.
8.15, 18.05 «Ірына Пячэрнікава. Ад першага да апошняга кахання...» Дак. фільм (12+) [СЦ].
8.50, 18.45 «Дажывём да панядзелка». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.35 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
11.05, 17.10 «Дом з лілеямі». Серыял (16+) [СЦ].
12.40 «Наперад у мінулае».
13.05, 21.05 «Сямнаццаць імгненняў вясны». Серыял (12+) [СЦ].
15.25 «Кадры жыцця».
16.30 «Сваімі словамі».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.25 «Камертон».

Беларусь 5

7.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Лестэр».
8.55 Хакей. КХЛ.
10.45 Слэм-данк.
11.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Брайтан».
13.10 Аўтаспорт. Экстрым-Е. Відэасапсопіс.
13.45 Між іншым.
14.05 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Агляд.
14.50 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. ХК «Мінск» — «Будаўнік» (Брэст).
16.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Арсенал».
18.05 Хакей для ўсіх.
18.40 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Металург» (Жлобін).
21.20 Спорт-цэнтр.
21.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Бернлі» — «Саўтгэмптан».
23.40 На шляху да ЧС — 2022. Відэасапсопіс.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.15 «Жыць здорава!» (16+)
11.15, 22.55 Серыял «Я вярнуся» (12+).
13.15, 16.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.55 Фільм «Начальнік разведкі» (16+).
0.45 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 23.20 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.15, 20.50, 0.55 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 0.10 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.45, 16.50 «Полымя над попелам». Серыял (12+).
20.20, 23.05 «СТБ-спорт».
20.25 «Сталічныя падрабязнасці».
20.35 «Міншчына».
23.10 «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў».

МІР

5.00 Серыял «Мой капітан» (12+).
7.20, 10.10 Серыял «Ганна Герман. Таямніца белага анёла» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15, 17.50 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15, 2.05 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10, 2.50 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.05 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.05 «Гульня ў кіно» (12+).
20.45, 21.35 «Слабае звяно» (12+).
22.30 «Назад у будучыню» (16+).
23.15 Мастацкі фільм «Таямніца «Чорных драздоў» (12+).
0.50, 1.15 «Гістарычны дэтэктыў з Мікалаем Валуевым» (12+).
1.40 Здабытак рэспублік» (12+).
3.30 Мастацкі фільм «Прыватнае жыццё Пятра Вінаградава» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Серыял «Земскі доктар» (12+).
21.05 Тэлесерыял.
22.10, 23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).
0.40 Фільм «Люба. Каханне» (16+).

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15, 7.15, 8.25, 16.40, 19.55, 21.55, 23.10 Сёння. Галоўнае.
6.20 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.00 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 22.00 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55, 16.50 Серыял «Прафесіянал» (16+).
17.10 «За гранню» (16+).
18.05 «ДНК» (16+).
20.10, 22.20 Серыял «Паліцэйскае брацтва» (16+).
23.25 Серыял «Смерць у аб'ектыве» (16+).

8 канал

7.00, 15.25, 18.55, 21.10, 1.05 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Рапунцэль» (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (6+).
8.15 Прыгодніцкі фільм «Вакол святла за 80 дзён» (6+).
10.15 Серыял «Эквадор».
11.00 Драма «Хітрасці лёсу» (16+).
11.45 Серыял «Чукур» (16+).
13.15 Баявік «Місія невыканальная» (16+).
15.30 «Хачу ў кіно» (12+).
15.40 Мультпарад. «Амфібія» (0+).
16.20 Серыял «Абацтва Даўнтан» (18+).
17.10 «Гатуй як шэф» (12+).
17.20 «Смачнае кіно» (12+).
19.00 Серыял «Сіндром» (16+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.00 «Салам алейкум, Беларусь!»
21.15 Драма «Геніяльнае рабаванне» (12+).
23.15 Фільм-катастрофа «Немагчымае» (16+).

ВТВ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45, 22.40 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.00 «Гатуем як шэф» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.25 «Эксперыменты» (12+).
13.50 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
14.45, 18.40 Серыял «Па калена» (16+).
16.05 Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
16.35 «6 кадраў» (16+).
17.00 Серыял «Вялікая гульня» (16+).
20.00 Серыял «Пагрукай у мае дзверы» (16+).
21.00 Драма «500 дзён лета» (12+).
0.00 Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
0.55 Серыял «90-я. Весела і гучна» (16+).
2.35 Серыял «Кадэцтва» (12+).
4.10 «Адна за ўсіх» (16+).
5.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

06.30, 7.00, 7.30, 8.20, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
06.35 «Пешшу...»
07.05 «Гісторыі ў фарфоры». Серыял.
07.35, 18.40 «Ісус Хрыстос. Жыццё і вучэнне» [СЦ].
08.25 Легенды сусветнага кіно.
08.50, 16.35 «Іркуцкая гісторыя». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.00 ХХ стагоддзе.
12.05 «Продкі нашых продкаў». Серыял.
12.45 Астравы. [СЦ].
13.30, 1.50 «Каханне і больш, чым каханне». Дак. фільм.
14.30 «Уладзімір Мінін. Маналог у 4 частках» [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 Пернікавы домік [СЦ].
15.50 «2 Вернік 2».
17.45, 0.50 Шэдэўры рускай харавой музыкі.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Почырк эпохі» з Кірылам Кяро. «Мая Плісецкая. Вялікая Мая!» [СЦ]
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 «Дажывем да панядзелка». Шчасце — гэта калі цябе разумеюць». Дак. фільм [СЦ].
21.30 «Энігма. Айдар Гайнулін».
22.15 «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял (16+). [СЦ].
23.10 «Неспадзяваны партрэт. Валянцін Курбатаў. Апошнія». Серыял [СЦ].
2.40 Колер часу.

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
6.50, 8.40, 9.40, 11.00, 12.55, 14.40, 15.40, 17.00, 18.50, 20.40, 21.40, 23.00, 0.55, 2.40, 3.0.
7.20 Маст. фільм «Агенты КДБ таксама ўлюбляюцца» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
13.20 Мастацкі фільм «Кантрабанда» (18+).
18.00 «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
19.15 Мастацкі фільм «Цягнік да Брукліна» (18+).
0.00 «СевАлогія» (18+).
1.20 Мастацкі фільм «Арол і рэшка» (18+).

EuroSport 1

0.00, 4.0. 8.00, 11.30, 16.20, 18.00, 20.45 Снукер. Чэмпіянат свету (6+).
0.55, 19.00, 20.40 Навіны (16+).
1.00, 11.00 Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
1.30, 7.00, 10.00 Веласпорт. «Флэш Валонь». Мужчыны (16+).
2.30, 9.30 Веласпорт. «Флэш Валонь». Жанчыны (16+).
3.15, 6.00, 14.00, 15.00, 19.05 Веласпорт. Тур Альпаў (16+).
19.45 Мотагонкі на выносліваць. «24 гадзіны Ле-Мана» (16+).
20.25 Кузаўныя аўтагонкі. ESET V4 Cup (16+).

Кінакамедыя

1.05 Чарапашкі-ніндзя-2: таямніца ізумруднага зелля (6+).
2.35 Кадры (12+).
4.45 Сястрычка, дзейнічай-2 (12+).
6.45 Забойны футбол (16+).
8.40 Бязлітасныя людзі (16+).
10.30 Ноч у Роксберы (18+).
12.05 Колькі ў цябе? (16+)
14.00 Вельмі дрэнная настаўніца (18+).
15.45 Калі свякроў — монстар... (16+)
17.35 Рэальныя кабаны (12+).
19.30 Хто я? (12+)
21.45 Падвойныя непрыемнасці (16+).
23.25 Хто падставіў труса Роджэра (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.35 «Громавы. Дом надзеі» (16+).
10.30 «Улецы» (12+).
11.00 «Поўня». Серыял (16+).
12.15 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 17.30 «Любоўная магія» (16+).
13.40, 18.05 «Старац» (16+).
14.40, 19.40, 3.15 «Сляпая» (16+).
15.35, 20.35, 4.05 «Варажбітка» (16+).
16.30 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
19.05 «Чытальнік» (12+).
21.30 «Сельскі дэтэктыў» (16+).
22.25 «На шляху да сэрца» (16+).
23.25 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.20 «10 самых» (16+).
0.50 «Піяніст» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.00, 5.40, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
6.50 Бандыткі (12+).
8.45 Кілеры (16+).
10.25 Праўдзівая хлусня (16+).
13.00 Іншапланецянін (6+).
15.05 Пяты элемент (16+).
19.00 Сжэнцы Морган ва ўцёках (16+).
20.50 Аднойчы ў Рыме (16+).
22.25 Як выйсці замуж за 3 дні (16+).
0.05 Узыходжанне Юпітэр (16+).
2.15 Госці (16+).
4.15 Патруль часу (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.45 Роба (6+).
7.35, 2.35 Прывід (6+).
9.30 Няўлоўныя (16+).
11.00 Няўлоўныя: апошні герой (16+).
12.20 Няўлоўныя: Бангкок (16+).
13.50 Няўлоўныя: джэкпот (16 +).
15.15, 0.55 Сямейны бюджэт (12+).
17.10, 17.40, 18.05, 18.30 Апошні з Магікян (12+).
19.00 Праклятыя чыноўнік (16 +).
20.30 Лёгкі на ўспамін (12+).
22.00 Напарнік (12+).
23.30 Падарунак з характарам (6+).
4.25 Каралева (12+).

National Geographic

6.00, 5.35 Навуковыя глупствы (16+).
6.35 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.15, 9.10 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
10.00, 10.55 Аўта-SOS (16+).
11.45, 12.30 Дзікі тунец (16+).
13.15, 14.10 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.00, 15.50, 1.55, 2.40 Космас: магчымыя сусветы (16+).
16.45 Інстынкт выжывання (16+).
17.35 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.25, 18.50 Фабрыка ежы ў Амерыцы (16+).
19.15 «Выццё каралевы» (16+).
20.05 Аперацыя «Каралеўскае вяселле» (12+).
21.00, 21.50, 3.25 Злавіць кантрабандыста (16+).
22.40 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
0.25, 1.10 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
4.10 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
4.55, 5.15 Гульні розуму (16+).

Discovery

8.00, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Утыльшчыкі: заезд на ракеце (12+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40 Як гэта зроблена? (12+)
12.05 Пчаліны кароль (12+).
13.00 Голыя і напалоханыя (12+).
17.35 Вулічныя гонкі (12+).
18.30 Палёты ўгыб Аляскі (12+).
19.25, 4.27 Вялікія брудныя гонкі (12+).
23.05, 0.00, 0.55, 5.14, 6.01, 6.48 Залатая ліхаманка (18+).
1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04 Бітвы за кантэйнеры (12+).
4.27 Вялікія брудныя гонкі (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

А РАНІЦОЙ ЯНЫ ЎСТАЛІ...

Гэта было два з гакам гады таму, калі ковід толькі пачынаў сваё страшнае шэсце і настрой у людзей быў часам панічны, асабліва ў пажылых ды адзінокіх. Ну яшчэ б! Тэлевізар кажа, каб «за плот» ні нагой, дзеці амаль не прыязджаюць, на сяло не сходзіш... А без гэтага што за жыццё? Сацработніца забяжыць, нешта прынясе, а каб пагаварыць, дык ёй жа часу няма: іншыя людзі чакаюць.

На Вялікдзень баба Люба не вытрымала, патэлефанавала сяброўцы:

— Хрыстос уваскрос, Манечка!..

— Сапраўды...

— А мы з табой — як тыя краты, па норах сядзім. Давай — ногі ў рукі — і да мяне. Адсвяткуем — дзеці столькі гасцінцаў прыслалі!

— Дык жа вірус, Люба, — нясмела запярэчыла Мар'я.

— А гары ён гарам!.. Калі і памром... Пажылі ж, дзякуй богу! І яшчэ пажывём: я лекі маю!

— Ну, калі так, то...

Кату (ён, гуляка, спаў яшчэ!) баба Маня падсунула кавалак каўбасы (трэба ж, каб і ў яго было свята!), наклала ў сумку прысмакаў, начапіла маску і рушыла да сяброўкі. Абняліся з ёй, пацалаваліся, разам накрылі стол. У цэнтр яго — перад тым як сесці — баба Люба паставіла бутэльку з нечым мутнаватым.

— Можа, лепей віна? — усумнілася госця. — Я прынесла... Хавай самагонку...

— Гэта пяршак! Стапрацэнтны забойца віруса! — з форсам удакладніла гаспадыня. — Я па навуцы — на праполісе і часнаку настаяла. Казалі, вып'еш — у арганізм ніякая зараза не прарвецца! Так што здымай сваю маску!

...І палілася ў кілішкі настойка... І пачалася гутарка. Маладосць жанчыны ўспомнілі, унукамі пахваліліся, нявестак-зяцёў паганілі, «Шумяць вербы...», «Рэчаньку» праспявалі... Баба Маня нават дамоў не пайшла — засталася ў сяброўкі. Сярод ночы, праўда, уставала: смага адолела. Ціхутка, навобмацак пасунулася ў кухню да вядра з вадой.

— Там на шафцы морс у слоіку, — прачнуўшыся, падказала Люба. — І мне падай, а то ў роце як у пустыні.

Баба Маня святла не ўключала — намацала слоік, прылажылася да яго сама, падала сяброўцы. Напіліся і зноў паснулі. А раніцай...

— Ой, Любачка, а што ў цябе губы сінія? — жахнулася Маня.

— І ў цябе...

— Такі ж падхапілі вірус! — забедавала Маня. — А ў мяне ж праўнучка хутка будзе... Я што — яе не ўбач-у?..

— Пачакай. Без панікі! — спыніла сяброўку Люба. — Кажуць, вірус нюх адымае. Давай праверым.

Жанчыны па чарзе панюхалі воцат, чорны перац у слоічку, герань на падаконніку і рэшткі ўчарашняй настойкі з часнаком ды праполісам, — пахі чуваць...

І нервы гараць!

— Мы ж варэнне з чарніц не елі?

— Не...

— Можа, кампот з іх пілі?

— Не! — закруціла галавой баба Люба. А потым шмыганула ў кухню і вярнулася адтуль са слоікам:

— Бабачкі, гэта ж я ў пятніцу фарбу для яек разводзіла — чырвоную, зялёную і сінюю. Вось яе мы, вароны старыя, ноччу і выпілі.

...На раніцу і сапраўды ў сяброўак застаўся морс, адведаўшы якога, баба Маня рушыла дамоў: можна сказаць, на крылах паляцела — з прыгаворам: «Пажыву яшчэ! Пагушкаю праўнучку!»

З той радасці вусны ўвесь час расплываліся ў шчаслівай усмешцы. І добра, што колеру іх пад маскай ніхто не бачыў.

Алена Несцяронак,

г. Докшыцы.

ЯШЧЭ РАЗ ПРА ТОРТ

Чытаючы нейчыя праўдзівыя гісторыі, міжволі ўспамінаеш свае.

У тыя, яшчэ даперабудовачныя, гады наш энергічны калектыў — сплаў вопыту і маладосці, — займаўся навукай і будаўніцтвам новага прадпрыемства, а пакуль, што называецца, арандаваў некалькі цеснаватых пакойчыкаў у розных месцах, за межамі сталіцы. Магчымасць улезці (так-так, бо праз горы будаўнічага смецця...) у свой будынак з'явілася далёка не адразу і якраз жа на згон зімы. Так што жаночае свята мы збіраліся адзначаць разам і на новым месцы. Праўда, сталовая ў нас яшчэ не працавала, але ж сталы з крэсламі ўжо стаялі. Было дзе сесці, было што з'есці і выпіць: начальства расстаралася, прычым не толькі на добрую выпіўку — нават на садавіну і з дзясятак тартоў.

Тады мы файна пасядзелі: бліжэй пазнаёміліся адзін з адным, пагаварылі, паспявалі, патанцавалі, палюбаваліся на нашых дзяўчат. І на «хлопцаў» таксама.

Віктару было гадоў пад 40: добры эканаміст, інтэлігент і сама абаяльнасць. Не дзіва, што мне, куды маладзейшаму, карцела быць бліжэй да яго, нешта мо нават пераняць.

Калега, як выглядала, быў не супраць, і ў той вечар мы шмат размаўлялі. Я, напрыклад, даведаўся, што жонка Віктара (ну бывае ж?!) працуе... у нашым універсаме, што жывём мы зусім непадалёк адзін ад аднаго...

А народ тым часам ужо стаў збірацца ды раз'язджацца па дамах. Нехта з цвярозых, «набіўшы» салоны п'янымі і п'янаватымі, садзіўся ў свае машыны, нехта выклікаў таксі, астатнія з песнямі шыбавалі на прыпынак грамадскага транспарту. Мы з Віктарам затрымаліся, яшчэ раз выпілі не тое аглаблёвую, не тое ліфтавую, па-джэнтльменску дапамаглі жанчынам з прыборкай сталоў, Віктар на правах гаспадара (яго жонка, працуючы ў краме, даставала ўсе прадукты) раздаў ахвотным «лішняе» з закусак... Торт — некрануты, перавязаны крамным шпагатам, даставаўся мне — бацьку малалетніх дзяцей. Я спачатку аднекваўся (маўляў, не такія ў мяне бедныя дзеці — перападае часам салодкае), але ж потым махнуў рукой: даюць — значыць, вазьму. Героем дамоў з'яўлюся: жонка спытае, чаму так позна. А я ёй з-за спіны торт — цэлы!

...Як мы з Віктарам дабіраліся дадому, шчыра скажу, не помню.

Помню, што назаўтра на рабоце сустрэліся, і ён стаў расказваць, які допыт учыніла жонка: маўляў, дзе ты быў, з кім гуляў, чаму гэтак позна... «Табе з гасцінцам, відаць, прасцей было?» — спытаўся ў мяне.

Прыйшлося прызнацца, што торт па дарозе, а найбольш на лесвічных прыступках (кватэра на трэцім паверсе) стаў... «ездзіць» па каробцы, ажываць, варушыцца, што я ўвесь час стараўся «паставіць» яго на месца. Спачатку (мяркуючы па бела-руковай дарожцы на сцяне пад'езда) — пальцамі, потым — усёй пяцярнёй ці нават кулаком, ад чаго дзверы і ў тамбур, і ў кватэру аказаліся ў крэмавай грунтоўцы.

Не лепшым быў я і тады, калі ўваліўся ў вітальню, працягнуў жонцы парваную, скамечаную каробку і загадаў: «Стаў чайнік — я торт прынёс!»

...Даўно гэта было, але не забылася: да сёння, калі іду недзе ў госці адзін, жонка просіць: «Толькі торт не прынось!»

Іван Гаральчук,

г. Мінск.

СОН У РУКУ,

альбо Што той Барыс, што гэты...

Кажуць, жарты нічога не варты, але часам праўдзяцца. Вы не верыце? Тады слухайце. Ці чытайце.

Лена, Надзя і Наташа сябравалі з дзяцінства. І потым былі неразлучнымі, калі падраслі, калі сталі з хлопцамі сустракацца, замуж выходзіць, дзяцей нараджаць...

Зрэшты, «замуж» і «дзеці» — словы пра дзвюх сябровак, пра Лену ды Наташу. Трэцяя, Надзя, што называецца, у дзеўках сядзела — з Боркам сустракалася. А ён — як цяпер гэта ў модзе — і не жаніўся з ёй, і не адпускаў: цягнуў ката за хвост, нечага чакаў...

І хоць бы ж прынц нейкі быў, а то, як казала гумарыстка Ражкова, ну чыста кабаняка: твар вялікі, вочкі на ім маленькія... Усяго і талентаў, што на гітары дрынкае: «Гоп-стоп, мы подошли из-за угла...». Такія вось песні! А Надзя, што крыўдна, слухае іх ды млее: найлепшыя гады кладзе на непатрэбнае, на пустое... Сяброўкі ёй пра гэта казаць стаміліся! Ды тут...

Лена кабана падгадавала (і, трэба сказаць, не слабага — пудоў на дзесяць), у выхадны сабрала талаку: мужы (яе і Наташын) парсюка завалілі, саломкай (у найлепшых традыцыях!) абсмалілі, дасталі вантробы, адрэзалі ладны кавалак падбрушша...

Жанчыны скварак ды пячонкі з цыбулькай насмажылі. Добранька пасядзелі — падсілкаваліся.

А потым — трэба ж за справу. Мужчыны пайшлі мяса парадкаваць, жанчыны — кішкі перабіраць. Справа гэта малапрыемная... А да ўсяго Надзя была стомленая (працавала ў начную)... Ды і глынула крыху... «Пайду, — кажа, — трошкі драману, бо вечарам мой Борка прыйдзе».

Прылягла яна і заснула. А ў хаце ж рух, работа... Гаспадар галаву свіную прынёс, на табурэтку паставіў: яна на дзяўчат адтуль «пазірае» і нібы ўсміхаецца. «Ну якраз, як Борка з яго ўсмешачкай!» — прызналі кабеткі. Трохі пахіхікалі.

Потым — для паўнаты карціны — цыгарэту ў пашчу ўваткнулі: «Дык ягоная ж копія!»

А далей — болей: разам з табурэткай падставілі тую галаву да Надзінага твару — зноў пахіхікалі — падзівіліся, якая парачка! Нават «сфоткалі» на тэлефон. І тады ўжо так разрагаталіся, што Надзя прачнулася — твар у твар, можна сказаць, са сваім «Барысам».

І не, яна зусім не служалася, а... спрасоння ўсміхнулася, быццам не разабралася, бо што гэты «Борка», што той...

А сяброўкі яшчэ і фотку пад нос.

...Надзя на яе, казалі, даўгавата дзівілася: нібы разглядала, які «яе» Бора і як яна з ім глядзіцца ў пары.

А потым нібы перамкнула яе. Кажа: «Усё, досыць лынды біць! Давайце за работу!»

І сапраўды, згадзіліся жанчынкі. Ім нават няёмка стала — знайшлі чым жартаваць.

І дарма! Бо Надзя ў той самы вечар «адшыла» Бору, стала сустракацца з Паўлікам. Ён, бедны, аж тры гады свайго шчасця чакаў!

Праз месяц маладыя вяселле згулялі, праз два гады пасля якога ў пары ўжо былі «хлопчык і хлопчык» — як у тога кінагероя.

...А свіней цяпер Лена не гадуе: «Борка» ў яе апошні быў і лёсавызначальны, можна сказаць, бо калі б не тая галава...

Невядома, як склалася б жыццё ў Надзеі.

Соф'я Вароніна,

Рагачоўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

РЭХА БУХЕНВАЛЬДА

Чаму гісторыя з нашым дзяржаўным сцягам — хутчэй заканамернасць

ТОЕ, што адбылося ў мінулы панядзелак у Бухенвальдзе, калі «неўстаноўленыя асобы» знялі з флагштока дзяржаўны сцяг Беларусі і замест яго павесілі бчб, — абуральна і дзіка. Але мяне, калі па шчырасці, гэта зусім не здзівіла. Як і адказ пасла Германіі, якога абураныя беларускія грамадзяне даклікаліся-такі каля варот пасольства, уключыўшы на ўсю гучнасць «День Победы». Чулі, што ён адказаў? Маўляў, прызнаю ваш дзяржаўны сцяг, на ўсіх афіцыйных мерапрыемствах яго выкарыстоўваем. Але ў Бухенвальдзе мерапрыемства ў памяць вязняў канцлагераў праводзіла не дзяржаўная, а грамадская арганізацыя, таму прабачце, канешне, але мы тут ні пры чым...

Дык вось, мяне гэта зусім не здзівіла, хоць менавіта цяпер мяжа прыстойнасці, здаровага сэнсу, людскасці пяройдзена канчаткова. Па гэтай мяжы, па самым яе краі, яны хадзілі ўжо даўно, а мы за гэтым назіралі і памяркоўна маўчалі: каб хоць не пакрыўдзіць каго. Дамаўчаліся — атрымалі. Тут нават справа не ў тым, што яны наш сцяг памянялі на іншы, значная частка нядоўгай і зусім няслаўнай біяграфіі якога прыпадае менавіта на самы страшны перыяд нашай гісторыі — час фашысцкай акупацыі. Яны дакрануліся да сцяга НАШАЙ краіны, яны пасмелі (ці беспакарана дазволілі «неўстаноўленым асобам») да яго дакрануцца — вось у чым пяройдзена найперш мяжа. Яны, якія пасля таго, што вытваралі на нашай зямлі іх дзяды і прадзеды, павінны на гэты сцяг нават дыхнуць мацней баяцца.

ЧАМУ мяне гэта не здзівіла? Скажу, напэўна, тое, што не спадабаецца пацыфістам і прыхільнікам «еўраінтэграцыі». Мы для іх даўно — як скула ў горле. Уявіце, як прасцей было ім жыць, пачуваць сябе ў сусветнай супольнасці, калі б нас не было. Фізічна. Зусім. Наколькі б меншае было пачуццё віны, якую яны ў большасці сваёй праз пакаленні ўжо і не адчуваюць, але якую трэба дэманстраваць, каб апраўдаць само сваё існаванне. Як бы прасцей было і лягчэй, калі б не было нас — нашчадкаў тых, каго яны рабавалі, катавалі, палілі жывымі, гналі ў рабства. Нас, у каго той невымерны жах так і застыў у геннай памяці, стаў часткай нашай ДНК, каму і сёння аб той вайне сняцца кашмары. Як бы ім прасцей і лягчэй было, калі б мы пра той жах забыліся, каб перапісалі гісторыю, зрабіўшы гэты жах не бясспрэчным. Калі б не было помнікаў, да якіх мы водзім сваіх дзяцей. Калі б не было Хатыні, куды — не хочаш, але ж мусіш — яны павінны ехаць і класці кветкі. А там, у Хатыні, — мы. Спаленыя і жывыя — разам, адзін народ. І нас — мора чалавечае. Тыя, хто памятае, і дзецям сваім накажа, каб памяталі.

Яны ж дагэтуль, калі расказваеш ім пра тое, што тут было ў вайну ці да яе або пасля, з надзеяй у голасе пытаюць: «Гэта пра якую вайну — пра Першую?» За Першую, падчас якой таксама тут не на балях танцавалі, яны адказнасці не нясуць. І за Другую рады б не несці. Але тут мы са сваімі аповедамі. І галоўнае — з амаль заўсёды такім нязручным для іх адказам: «Не, пра Другую».

